ЛЮТЫ 20 ЧАЦВЕР
№ 8 (507)
1941 год
ЦАНА 20 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА САВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б)

Дзённік пасяджэння
15 лютага

15 лютага ў Вялікім зале Крэмлёўскага палаца пачала сваю работу XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б).

Задоўга да пачатку пасяджэння ў зале збіраюцца дэлегаты канферэнцыі і госці— партыйныя, савецкія, гаспадарчыя і ваенныя работнікі, стаханаўцы заводаў і фабрык сталіцы. На канферэнцыі шырока прадстаўлены партыйныя арганізацыі буйнейшых прамысловых цэнтраў і важнейшых транспартных вузлоў краіны, у тым ліку—новых індустрыяльных цэнтраў, узнікшых за гады сталінскіх пяцігодак. Сярод дэлегатаў—прадстаўнікі камуністычных партый новых Саюзных Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік — Латвійскай, Літоўскай, Эстонскай, Карэла-Фінскай і Малдаўскай.

У 18 гадзін у зале паяўляюцца таварышы: **І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, Л. М. Кагановіч, А. А. Андрэеў, А. А. Жданаў, А. І. Мікаян, Н. С. Хрушчоў, Л. П. Берыя, Н. М. Швернік, Г. М. Маленкоў.**

Дэлегаты і госці з выключным уздымам сустракаюць таварыша Сталіна і яго саратнікаў—кіраўнікоў партыі і ўрада. Усе ўстаюць. Некалькі мінут не змаўкаюць магутная авацыя і прывітальныя воклічы ў чэсць таварыша Сталіна, у чэсць ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта ВКП(б):

— Няхай жыве таварыш Сталін!

— Вялікаму Сталіну — ура!

Тав. А. А. Жданаў па даручэнню Цэнтральнага Камітэта партыі аб'яўляе XVIII Усесаюзную канферэнцыю ВКП(б) адкрытай. Слова для прапановы аб саставе выбарных органаў канферэнцыі прадастаўляецца сакратару МК і МГК ВКП(б) тав. **А. С. Шчэрбакову.**

Па даручэнню савета прадстаўнікоў дэлегацый тав. Шчэрбакоў прапануе выбраць прэзідыум у саставе 38 чалавек. Гэта прапанова канферэнцыяй прымаецца.

Калі тав. Шчэрбакоў, пераходзячы да персанальнага састава прэзідыума, называе імя таварыша Сталіна, у зале зноў узнікае авацыя. Усе ўстаюць, горача вітаючы вялікага правадыра партыі і савецкага народа. Бурнымі апладысментамі сустракаюцца імёны кіраўнікоў партыі і ўрада—таварышоў Молатава, Варашылава, Калініна, Кагановіча, Андрэева, Жданава, Мікаяна, Хрушчова, Берыя, Шверніка, Маленкова.

Пасля выбрання прэзідыума, сакратарыята і мандатнай камісіі канферэнцыя зацвярджае парадак дня і рэгламент.

Старшынствуючы тав. А. А. Жданаў прадастаўляе слова для даклада па першаму пытанню парадку дня сакратару ЦК ВКП(б) тав. **Г. М. Маленкову,** сустрэчанаму дэлегатамі канферэнцыі бурнымі апладысментамі. Даклад тав. Маленкова быў выслухан з неаслабяваючай увагай.

На гэтым першае пасяджэнне XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б) заканчваецца.

Наступнае пасяджэнне канферэнцыі назначана на 17 лютага ў 11 гадзін дня.

(ТАСС).

Прэзідыум канферэнцыі

1. АЛЕМАСАЎ А. М.
2. АНДРЭЕЎ А. А.
3. АНОШЫН І. С.
4. АРУЦІНАЎ Г. А.
5. БАГІРАЎ М. Д.
6. БЕРЫЯ Л. П.
7. БАРАДЗІН П. Г.
8. БУРМІСТЭНКА М. А.
9. ВАГАЎ А. В.
10. ВАРАШЫЛАЎ К. Е.
11. ЖДАНАЎ А. А.
12. КАГАНОВІЧ Л. М.
13. КАЛІНІН М. І.
14. КАЛНБЕРЗІН Я. З.
15. КУЗНЕЦОЎ А. А.
16. КУПРЫЯНАЎ Г. Н.
17. КУУСІНЕН О. В.
18. КАРНІЕЦ Л. Р.
19. МАЛЕНКОЎ Г. М.
20. МІКАЯН А. І.
21. МІХАЙЛАЎ Н. А.
22. МОЛАТАЎ В. М.
23. НІКАЛАЕВА К. І.
24. ПАНАМАРЭНКА П. К.
25. ПРАТАПОПАЎ Д. З.
26. СКВАРЦОЎ Н. А.
27. СНЕЧКУС А. Я.
28. СТАЛІН І. В.
29. СЯРЭ К. Я.
30. ТІМАШЭНКА С. К.
31. ФОНІН М. М.
32. ХРУШЧОЎ Н. С.
33. ЧАРКВІЯНІ К. Н.
34. ШВЕРНІК Н. М.
35. ШКІРАТАЎ М. Ф.
36. ШЧЭРБАКОЎ А. С.
37. ЮСУПАЎ У.
38. ЯРАСЛАЎСКІ Ем.

Сакратарыят канферэнцыі

ПАСКРЭБЫШАЎ А. Н.
МЕХЛІС Л. З.
АЛЕКСАНДРАЎ Г. Ф.
ДЗВІНСКІ Б. А.
ПАСПЕЛАЎ П. Н.

Мандатная камісія канферэнцыі

АНДРЫЯНАЎ В. М.
БАРКОЎ Г. А.
ЗАДЗІОНЧЭНКА С. Б.
НІКІЦІН В. Д.
ПАЛЬЦЭЎ Г. Н.
ПАТОЛІЧЭЎ Н. С.
ПАПОЎ Г. М.
РАДЗІОНАЎ М. І.
САУЧЭНКА А. А.
СУСЛОЎ М. А.
ЧУЯНАЎ А. С.
ШАМБЕРГ М. А.
ШАТАЛІН Н. Н.

ПАРАДАК ДНЯ
XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б)

1. Аб задачах партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта—дакладчык т. МАЛЕНКОЎ.
2. Гаспадарчыя вынікі 1940 года і план развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1941 год—дакладчык т. ВАЗНЕСЕНСКІ.
3. Арганізацыйныя пытанні.

Аб задачах партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

Даклад тав. Г. М. МАЛЕНКОВА

I.

Поспехі і недахопы ў рабоце прамысловасці і транспарта

Таварышы! На абмеркаванне канферэнцыі пастаўлена пытанне аб задачах партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта.

У сваім дакладзе па гэтаму пытанню я буду гаварыць, галоўным чынам, аб недахопах работы прамысловасці і транспарта, аб недахопах работы партыйных арганізацый і наркаматаў у галіне прамысловасці і транспарта, аб прычынах гэтых недахопаў і аб мерах іх устранення.

Гэта зусім, таварышы, не азначае, што мы не маем поспехаў у рабоце прамысловасці і транспарта. Наадварот, за два годы, прайшоўшыя пасля XVIII з'езда партыі, прадаўжаўся няўхільны рост прамысловасці і транспарта.

Калі ў 1938 годзе аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці склаў 106.834 млн. рублёў, то ў 1939 г. ён дасягнуў 123.915 млн. рублёў, а ў 1940 г. склаў 137.500 млн. рублёў.

Значыцца, з года ў год мы маем велізарны прырост валавой прадукцыі прамысловасці.

Палепшылася за прайшоўшыя два годы і работа нашага транспарта. У 1940 г. у параўнанні з 1938 г. грузаабарот павялічыўся: па чыгуначнаму транспарту на 10,3 процанта, па рачному транспарту — на 12,8 процанта і па марскому транспарту ў малым кабатажы — на 15,1 процанта.

У прайшоўшым годзе прамысловасць і транспарт Савецкага Саюза значна прасунуліся ўперад у справе выканання трэцяга пяцігадовага плана, павялічылі аб'ём вытворчасці і грузаабароту, забяспечылі далейшы рост народнай гаспадаркі і ўмацаванне абароннай магутнасці СССР. Поспехі асваення новай тэхнікі і рост абароннай прамысловасці дазволілі значна павысіць тэхнічную аснашчонасць Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота навейшымі відамі і тыпамі сучаснага ўзбраення.

На XVIII з'ездзе партыі таварыш Сталін гаварыў, што для таго, каб перагнаць галоўныя капіталістычныя краіны ў эканамічных адносінах, патрабуецца перш за ўсё сур'ёзнае і неўкрапімае жаданне ісці ўперад і гатоўнасць пайсці на афяры, пайсці на сур'ёзныя капітальныя ўкладанні для ўсямернага расшырэння нашай сацыялістычнай прамысловасці.

За прайшоўшыя два годы мы ўклалі велізарныя сродкі ў прамысловасць і транспарт і пусцілі ў ход многа новых прадпрыемстваў.

Капіталаўкладанні ў прамысловасць і транспарт за 1938 год склалі 22.341 млн. рублёў, за 1939 год—25.037 млн. рублёў, за 1940 год — 27.728 млн. рублёў.

Наша партыя няўхільна праводзіць у жыццё вучэнне таварыша Сталіна аб сацыялістычнай індустрыялізацыі. Індустрыялізацыя СССР з'явілася законам сацыялістычнага развіцця нашай краіны.

Трэба ўсё мець у сваіх руках, каб не стаць прыдаткам капіталістычнай гаспадаркі — вучыць таварыш Сталін. Кіруючыся гэтым указаннем, наша партыя забяспечыла самастойнасць народнай гаспадаркі СССР.

Трэба развіваць прамысловасць, развіваць гаспадарку ў інтарэсах перамог сацыялізма, у інтарэсах будаўніцтва сацыялізма — вучыць таварыш Сталін. Кіруючыся гэтым указаннем, наша партыя дабілася таго, што ў нашай краіне закрыты ўсе клапаны для ўзнікнення капіталізма.

СССР ужо цяпер з'яўляецца магутнай індустрыяльнай сацыялістычнай дзяржавай.

Аднак, таварышы, побач з гэтымі поспехамі, у рабоце прамысловасці і транспарта ёсць буйныя недахопы.

Наша прамысловасць у цэлым хоць і павялічыла выпуск прадукцыі ў 1940 годзе на 11 процантаў параўнальна з 1939 годам, аднак рад галін прамысловасці, у асаблівасці паравоза- і вагонабудаўніцтва, электрапрамысловасць, лясная, папяровая, рыбная і прамысловасць будматэрыялаў, адстаюць і не выконваюць вытворчых планаў.

Некаторыя з наркаматаў, выканаўшы план па валавой прадукцыі ў цэлым не выканалі ў той-жа час плана па раду важных відаў прадукцыі. Так паступілі Наркамат Тэкстыльнай Прамысловасці, Наркамат Харчовай Прамысловасці і Наркамат Лёгкай Прамысловасці.

Гэта, вядома, сур'ёзны мінус у рабоце ўпамянутых наркаматаў. Для наркамата выканаць план — гэта значыць выканаць яго па ўсіх без выключэння відах прадукцыі, а не толькі па тых, якія лягчэй даюцца.

Ёсць і такія наркаматы, якія не толькі не выканалі плана 1940 года, але ў параўнанні з 1939 годам нават некалькі зменшылі выпуск валавой прадукцыі. Да іх ліку адносяцца Наркамат Рыбнай Прамысловасці, Наркамат Прамысловасці Будматэрыялаў, Наркамат Лясной Прамысловасці.

Трэба прама сказаць, што гэтыя наркаматы працавалі горш другіх наркаматаў.

Сур'ёзным недахопам у рабоце раду галін прамысловасці з'яўляецца нясвоечасовы ўвод у дзеянне новых вытворчых магутнасцей.

У радзе галін прамысловасці з-за дапушчаных перарасходаў сыравіны, матэрыялаў, паліва, электраэнергіі, вялікіх страт ад браку і іншых безгаспадарчых расходаў не выканан план па зніжэнню сабекошту прамысловай прадукцыі. Асабліва дрэнна абстаіць справа з выкананнем плана зніжэння сабекошту ў нафтавай, лясной, папяровай прамысловасці і прамысловасці будматэрыялаў.

Электрастанцыі, роля якіх выключна важная, дабіліся палепшання сваёй работы ў 1940 годзе, але на электрастанцыях і асабліва ў электрасецях мае месца ўсё яшчэ вялікая колькасць аварый з прычыны расхлябанасці тэхнічнага персанала і невыканання правіл тэхнічнай эксплаатацыі. Новая тэхніка ў электрагаспадарцы: пераход на высокі ціск і высокую тэмпературу пара, аўтаматызацыя кіравання агрэгатамі, прымяненне сучаснай, быстрадзеючай электраахovы —уніядраецца павольна і ў недастатковых размерах.

У рабоце чыгуначнага транспарта буйным недахопам з'яўляецца невыкананне па раду чыгунак плана перавозак важнейшых грузаў, плана па абароту вагонаў грузавога парка і плана сярэдне-сутачнай пагрузкі. На чыгунках вялікая колькасць грузавых паяздоў следавалі не па раскладу, не арганізаван як належыць пасажырскі рух і не ліквідавана спазненне паяздоў.

Па марскому і рачному транспарту не выконваюцца планы перавозак, асабліва па такіх важных відах прадукцыі, як руда, нафта, хлеб, соль, лес, вугаль, цэмент. Вялікія прастоі танажа і рухомага састава, затрымка грузаў у пунктах перавалкі маюць месца з-за таго, што ў рабоце чыгуначных станцый, портаў і прыстаней няма яшчэ неабходнай увязкі.

Такія поспехі і недахопы ў рабоце прамысловасці і транспарта.

II.

Прычыны недахопаў у рабоце наркаматаў і партарганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

Якія-ж, таварышы, прычыны нездавальняючай работы раду галін прамысловасці і транспарта?

Мы абавязаны ўскрыць гэтыя прычыны з усёй большэвіцкай праматой. Чым больш чэсна мы ўскрыем нашы недахопы, тым хутчэй ад іх вызвалімся. Гэтаму штодзённа вучыць нас таварыш Сталін. Людзі, замазваючыя недахопы, аказваюць дрэнную паслугу партыі.

Прычыны нездавальняючай работы прамысловасці і транспарта заключаюцца ў недахопах кіраўніцтва з боку наркаматаў і ў тым, што абкомы і гаркомы партыі аслабілі сваю работу ў галіне прамысловасці і транспарта.

Аб наркаматах трэба сказаць, перш за ўсё, што яны вядуць сваю работу ва многім бюракратычна, не дабіраюцца яшчэ да кожнага асобнага прадпрыемства, «кіруюць» сваімі прадпрыемствамі не па сутнасці, а фармальна, шляхам папяровай перапіскі.

Наркаматы дрэнна ведаюць кіруючыя кадры прадпрыемстваў, не ведаюць становішча спраў на прадпрыемствах і не прымаюць аператыўных мер па выпраўленню недахопаў у рабоце прадпрыемстваў. Кіруючыя работнікі наркаматаў рэдка бываюць на заводах, асабіста не дапамагаюць заводам наладзіць справу, лічаць, як відаць, за лепшае кіраваць па-канцылярску, толькі праз паперу.

Буйнейшым недахопам у рабоце наркаматаў з'яўляецца тое, што яны не правяраюць выкананне сваіх рашэнняў дырэктарамі прадпрыемстваў. Наркаматы абмяжоўваюць, такім чынам, рамкі сваёй кіруючай работы пасяджэннямі калегій і прыняццем рашэнняў, не разумеючы, што рашэнне — гэта толькі яшчэ пачатак справы і што рашэнні прымаюцца не для самых рашэнняў, а для іх выканання, не разумеючы, што галоўную частку кіруючай работы павінна складаць не засядацельская работа і не прыняцце рашэнняў, а штодзённая праверка выканання гэтых рашэнняў.

Многія дырэктывы астаюцца нявыканымі толькі таму, што замест сістэматычнай праверкі выканання дырэктыў наркаматы звычайна мяркуюць аб становішчы спраў на прадпрыемствах па рапартах дырэктараў фабрык, заводаў і начальнікаў чыгунак. Дырэктар-жа прадпрыемства, начальнік чыгункі з вузка-ведамственых меркаванняў часта замазвае недахопы і прыхарашвае сапраўднае становішча на прадпрыемствах.

У наркамаце звычайна ніхто не адказвае за выкананне канкрэтных рашэнняў.

Вось некалькі фактаў, характарызуючых канцылярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва наркаматаў.

Возьмем Наркамат Марскога Флота. Пастановай Эканомсовета ад 7 сакавіка 1940 года тав. Дукельскі абавязан быў у месячны тэрмін прадставіць у Эканомсовет план ліквідацыі запушчанасці Каспійскага флота. Гэтая пастанова ў тэрмін выканана не была. Нарком узбудзіў хадайніцтва аб адтэрміноўцы. Эканомсовет адтэрмінаваў прадстаўленне плана да 1 мая 1940 года. Зноў тав. Дукельскі не прадставіў плана. 11 кастрычніка 1940 года з Эканомсовета паступіла прапанова Наркому тав. Дукельскаму паскорыць прадстаўленне плана аб ліквідацыі запушчанасці Каспійскага флота. На пісьме з Эканомсовета тав. Дукельскі налажыў кароткую рэзалюцыю: «Тт. Лесавікову (гэта нам. Наркома) і Воранаву (гэта начальнік планавага аддзела) — дзе праект плана?» Гэтае пытанне Наркома больш двух месяцаў вісела ў паветры. Толькі 31 снежня работнік планавага аддзела тав. Гінзбург здаў праект плана тав. Лесавікову. 2 студзеня ўжо 1941 года тав. Лесавікоў перадаў гэты матэрыял начальніку аддзела тэхнічнай эксплаатацыі тав. Чэхоўскаму, які трымаў гэты праект да 16 студзеня 1941 года, а затым зноў перадаў яго таму-ж тав. Гінзбургу. 25 студзеня 1941 года, г. зн. праз $10^{1}/_{2}$ месяцаў пасля рашэння Эканомсовета, тав. Дукельскі прадставіў, нарэшце, у Эканомсовет план па ліквідацыі запушчанасці Каспійскага флота.

Дазвольна запытаць тав. Дукельскага, колькі-ж часу думае патраціць Наркамат Марскога Флота на ліквідацыю самой запушчанасці Каспійскага флота, калі план ліквідацыі гэтай запушчанасці складаўся на працягу $10^{1}/_{2}$ месяцаў. Ды невядома яшчэ, што гэта за план!

Вось факт з дзейнасці Наркамата Электрапрамысловасці. 29 кастрычніка 1940 г. Наркаматам Электрапрамысловасці было атрымана ўказанне аб пастаўцы абсталявання Наркамату Суднабудаўнічай Прамысловасці к 10 лістапада 1940 года з харкаўскага электрамеханічнага завода. Нарком тав. Багатыроў на паступіўшым да яго дакуменце налажыў наступную рэзалюцыю: «Да начальніка ваеннага аддзела т. Краўнова — падрыхтаваць тэрмінова распараджэнне 30 кастрычніка па гэтаму рашэнню». Распараджэнне рыхтавалася 5 дзён і толькі 6 лістапада яно папала ў Галоўэлектрамашпром гэтага-ж наркамата. Галоўны інжынер гэтага главка тав. Рубо толькі 10 лістапада пасылае гэтае тэрміновае распараджэнне начальніку вытворчага аддзела свайго главка тав. Арцёмаву з рэзалюцыяй: «Даць распараджэнне». Тав. Арцёмаў, у сваю чаргу, піша дыспетчару главка тав. Краўчуку: «На распараджэнне», а тав. Краўчук у гэты-ж дзень, 10 лістапада, г. зн. калі абсталяванне павінна было-б ужо прыбыць на заводы, якія яго чакаюць, налажыў рэзалюцыю: «У справу», г. зн. у архіў. Так было сарвана выкананне важнага задання.

Хіба ўсе гэтыя — «падрыхтаваць распараджэнні», «даць распараджэнне», «на распараджэнне» і, нарэшце, «у справу» — не з'яўляюцца сведчаннем чыноўніцкіх, бюракратычных адносін да жывой справы з боку работнікаў Наркамата Электрапрамысловасці? Хіба магчымы былі-б падобныя факты пры наяўнасці ў наркамаце элементарнай праверкі выканання?

Або вось аб Наркамаце Рачнога Флота. Калегія гэтага наркамата ў 1940 годзе засядала 62 разы, заслухала 102 пытанні, а рашэнні на самой калегіі былі прыняты толькі па 7 пытаннях. Падрыхтоўка рашэнняў па астатніх пытаннях даручалася камісіям. Большасць пытанняў камісіямі рэдагуецца на працягу некалькіх месяцаў, паколькі ніхто ў наркамаце не правярае даручаных заданняў. А, напрыклад, рашэнне па пытанню «Аб выніках выканання паказальнікаў па працы і фінансах» камісіяй пад старшынствам Наркома т. Шашкова рэдагуецца цэлых паўгода — з 20 жніўня і па сёнешні дзень.

Пры такіх парадках у рабоце можна загубіць любую жывую справу. Не дзіўны таму і дрэнныя рэзультаты работы Наркамата Рачнога Флота па перавозках грузаў.

Два словы аб Наркамаце Боепрыпасаў. У гэтым наркамаце мелі месца такія, напрыклад, факты. Нарком тав. Сяргееў у сваім загадзе № 203 прапанаваў дырэктару завода № 176 «пабудаваць фасфатыровачнае аддзяленне цэха № 4, змантыраваць ванны і здаць у эксплаатацыю. Тэрмін выканання — 8 чэрвеня 1940 года». Загад быў падпісан 5 чэрвеня, здан для рассылкі 7 чэрвеня, а тэрмін выканання ўказаны ў загадзе работы, як бачыце, быў вызначан 8 чэрвеня. Або вось другі загад № 189. Гэтым загадам завод № 144 абавязваўся «не пазней 1 чэрвеня 1940 года распрацаваць графік работы цэхаў на чэрвень месяц з улікам пакрыцця недадзелак за красавік-май месяцы». Гэты загад быў падпісан 31 мая і натуральна, што прыбыў на завод толькі пасля сканчэння тэрміна, устаноўленага для выканання задання. Вось трэці факт. Загадам № 151 адзначаецца дрэннае становішча тэхнікі безапаснасці на заводах. Пунктам восьмым выканаўцы абавязваюцца прадставіць тав Сяргееву на зацвярджэнне 29 красавіка план работ, а сам загад падпісан 4 мая.

Хіба гэта сур'ёзныя адносіны да справы? Трэба-ж удумвацца ў заданні, якія даюцца падначаленым. А загады, прыведзеныя вышэй, здольны толькі падарваць дысцыпліну.

Прыкладаў бюракратызма, канцылярскай валакіты, адсутнасці праверкі выканання можна прывесці многа, яны ёсць на жаль у кожным наркамаце, а колькі-небудзь сур'ёзнага штодзённага кантролю за работай прадпрыемстваў няма! Між тым сур'ёзны штодзённы кантроль за работай заводаў з'яўляецца важнейшым абавязкам наркаматаў.

Неабходна, каб наркаматы пакончылі з канцылярска-бюракратычнымі метадамі кіраўніцтва прадпрыемствамі і каб замест усёй гэтай канцыляршчыны ўсур'ёз заняліся справай праверкі выканання ра-

Працяг на 2-й стар.

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б)

Аб задачах партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

Даклад тав. Г. М. МАЛЕНКОВА

шэнняў, справай кантролю за работай сваіх прадпрыемстваў.

Такія недахопы ў кіраўніцтве наркаматаў.

Цяпер аб недахопах работы партарганізацый у галіне прамысловасці і транспарта.

Галоўнае тут заключаецца ў тым, што партарганізацыі не дапамагаюць наркаматам, прадпрыемствам сваёй вобласці, горада, раёна.

Партарганізацыі аслабілі сваю работу як у прамысловасці, так і на транспарце, няправільна лічачы, што яны не нясуць адказнасці за работу прамысловасці і транспарта.

Мясцовыя партыйныя арганізацыі, таксама як і гаспадарчыя арганізацыі, не разумеюць сэнсу і значэння праверкі выканання і не дапамагаюць з прычыны гэтага наркаматам і главкам наладзіць штодзённую праверку выканання рашэнняў наркаматаў дырэктарамі падпарадкаваных ім прадпрыемстваў.

Многія абкомы партыі, займаючыся сельскай гаспадаркай, справамі загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў, закінулі работу ў прамысловасці і на транспарце, забылі аб сваёй адказнасці за работу заводаў, фабрык, шахт, руднікоў, чыгунак сваёй вобласці, горада, раёна, а гаркомы партыі, якія абавязаны галоўную сваю ўвагу ўдзяляць прамысловасці і транспарту, не займаюцца гэтай справай і не прымаюць мер для палепшання работы адстаючых прадпрыемстваў і чыгунак. Гаркомы і абкомы партыі замест таго, каб улязаць у справы фабрык, заводаў, чыгунак, нярэдка стаяць у баку ад прамысловасці і транспарта, не кантралююць работу прадпрыемстваў, не правяраюць, як працуюць кіруючыя людзі на фабрыках, заводах і чыгунках, не ўскрываюць недахопаў у іх рабоце і тым самым патураюць гэтым недахопам.

Гаркомы і абкомы партыі звыкліся з тым становішчам, што рад прадпрыемстваў у іх доўгі час знаходзіцца ў глыбокім прарыве, і не прымаюць дзейсных мер к таму, каб пакончыць з гэтай ганебнай з'явай.

Возьмем Тульскую вобласць. У вас, таварышы туляк¡, такія заводы, як Новатульскі металургічны завод, Сталінагорскі камбінат і некаторыя іншыя буйныя прадпрыемствы, выконвалі вытворчы план апошнія чатыры гады не звыш чым на 60—80 проц.

У Чэлябінскай вобласці такія заводы, як Чэлябінскі трактарны завод і Чэлябінскі цынкавы завод, на працягу апошніх чатырох год сістэматычна недавыконваюць вытворчай праграмы на 15—20 процантаў.

Або вось, возьмем Арлоўскую вобласць. Такое буйнейшае прадпрыемства вобласці, як «Красный Профинтерн», у 1938 годзе выканала план на 66 процантаў, у 1939 годзе на 63 проценты і ў 1940 годзе на 75 процантаў.

У Архангельскай вобласці Саламбальскі цэлюлозны завод, Лальская папяровая фабрыка і рад буйных лесазаводаў вобласці выконвалі за апошнія тры годы план усяго толькі ў межах ад 40 да 80 процантаў.

У Башкірскай АССР Беларэцкі металургічны завод у 1938 годзе выканаў план на 77 процантаў, у 1939 годзе — на 71 процант і ў 1940 годзе — на 86 процантаў.

Такіх фактаў сістэматычнага адставання заводаў можна прывесці многа і па ўсіх іншых абласцях, краях і рэспубліках.

А ўсімі-ж гэтымі заводамі займаюцца, або, дакладней, павінны займацца абкомы і гаркомы партыі. Рэзультаты-ж, як бачыце, такія, што гэтыя і падобныя ім заводы ўжо рад год сядзяць на шыі дзяржавы.

Асабліва дрэнна гаркомы і абкомы партыі займаюцца прадпрыемствамі і прамысловымі будоўлямі, падпарадкаванымі саюзным наркаматам, памылкова лічачы, што за становішча спраў на гэтых прадпрыемствах і будоўлях адказваюць выключна наркаматы.

Рад абласцей сваёй дрэннай работай зрабілі рашаючы ўплыў на зрыў выканання агульнага плана па некаторых важных відах прадукцыі.

Па выплаўцы чыгуна асабліва дрэнна працавалі прадпрыемствы Сталінскай, Запарожскай і Свярдлоўскай абласцей.

Прадпрыемствы вугальнай прамысловасці Варашылаўградскай, Чэлябінскай, Свярдлоўскай і Молатаўскай абласцей пацягнулі назад вугальную прамысловасць.

Па здабычы нафты асабліва дрэнна працавалі прадпрыемствы Грознафты Чачэна-Інгушскай АССР, Майкопнафты, Краснадарскага края, прадпрыемствы Башкірскай АССР і Хабараўскага края.

Адставанне вытворчасці паравозаў з'явілася рэзультатам дрэннай работы адпаведных прадпрыемстваў горада Харкава, Орджанікідзеграда, Улан-Удэ. Дрэнна таксама працавалі Варашылаўградскі і Каломенскі заводы.

Рашаючую ролю ў недавыкананні плана па бавоўнянапапяровых тканінах адыграла дрэнная работа прадпрыемстваў абласцей Іванаўскай, Калінінскай і асабліва Яраслаўскай.

Рад прамысловых гарадоў, у якіх сканцэнтраваны буйныя прадпрыемствы, не выконваюць вытворчага плана. Вось, напрыклад, гор. Горкій у 1940 годзе выканаў план па выпуску валавой прадукцыі на 93,6 процанта, Днепрапятроўск — на 95.8 процанта, Сталінград — 95.8 процанта, Калінін — 93.7 процанта, Чэлябінск — 90,2 процанта, Тула — 85,1 процанта, Яраслаўль — 79.9 процанта, Сталіно — 90,3 процанта.

А пярвейшым-жа абавязкам гаркомаў партыі ў гэтых гарадах з'яўляецца забеспячэнне паспяховай работы прамысловасці.

Буйным недахопам у рабоце гаркомаў і абкомаў партыі з'яўляецца тое, што яны не ўваходзяць у сутнасць работы прадпрыемства, не вывучаюць эканоміку прадпрыемстваў і, замест гэтага, аддзелваюцца часта павярхоўнымі абследваннямі і верхаглядскімі рашэннямі.

Факт-жа, таварышы, што многія нашы абкомы і гаркомы партыі свае абавязкі ў адносінах прамысловасці і транспарта зводзяць да заслухоўвання дакладаў дырэктараў прадпрыемстваў на пасяджэннях бюро абкомаў партыі. Па гэтых дакладах звычайна выносяцца малаканкрэтныя і малакарысныя для заводаў рашэнні. Ды і гэтыя рашэнні, як правіла, зусім не правяраюцца.

Трэба адзначыць і другую акалічнасць. Займацца асобным прадпрыемствам абком або гарком партыі пачынае толькі ў вы падку, калі гэтае прадпрыемства ўжо знаходзіцца ў яўным прарыве. Загадзя-ж ніхто і не думае дапамагчы заводу або чыгунцы.

Неабходна пакончыць з такім павярхоўным падыходам да прадпрыемстваў прамысловасці і транспарта.

Гарадскія і абласныя камітэты партыі абавязаны побач з наркаматамі несці адказнасць за работу ўсіх прамысловых і транспартных прадпрыемстваў горада, вобласці. Іменна гаркомы і абкомы партыі маюць магчымасць непасрэдна на месцы найбольш аб'ектыўна, не лічачыся з вузкаведамственымі інтарэсамі, разабрацца ў становішчы спраў на прадпрыемстве, вызначыць, у чым крыюцца недахопы ў яго рабоце, і дапамагчы кіруючым работнікам прадпрыемстваў і наркаматаў устраніць іх.

Такія, таварышы, прычыны нездавальняючай работы раду галін прамысловасці, такія прычыны недахопаў у рабоце прамысловасці і транспарта.

III.

Гаспадарча-палітычныя задачы партарганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

Што-ж патрабуецца ад партыйных арганізацый для таго, каб ліквідаваць недахопы ў рабоце прамысловасці і транспарта?

Для гэтага трэба перш за ўсё безумоўна ліквідаваць бездзейныя адносіны партыйных арганізацый да становішча прамысловасці і транспарта і рашуча **павярнуць увагу партарганізацый у бок максімальных клопатаў аб патрэбах і інтарэсах прамысловасці і транспарта.**

Партыйныя арганізацыі абавязаны сістэматычна ўлязаць у справы прамысловых прадпрыемстваў і чыгунак, высвятляць іх патрэбы і запросы і дапамагаць гаспадарчым арганізацыям у іх штодзённай рабоце па кіраўніцтву прамысловасцю і транспартам.

Партыйныя арганізацыі да гэтага часу галоўную ўвагу ўдзялялі кіраўніцтву сельскай гаспадаркай. І гэта было правільна, пакуль зерневая праблема не была яшчэ вырашана. Але цяпер, калі ў асноўным ужо вырашана зерневая праблема і задача штогодняга атрымання ўраджаю зерня ў 7—8 мільярдаў пудоў, — **неабходна павярнуць партыйныя арганізацыі ў бок прамысловасці і транспарта.** Гэта не значыць, што трэба аслабіць увагу да сельскай гаспадаркі. Але гэта значыць, што партыйныя арганізацыі настолькі выраслі, што яны могуць заняцца **ў роўнай меры** і прамысловасцю і сельскай гаспадаркай.

Важнейшай, неадкладнай задачай усіх партыйных арганізацый з'яўляецца ліквідацыя недахопаў у іх рабоце ў галіне прамысловасці і транспарта.

Партыйныя арганізацыі абавязаны дапамагчы наркаматам і прадпрыемствам навесці парадак на фабрыках, заводах, шахтах, чыгунках, у портах і на прыстанях. Пры гэтым трэба заняцца канкрэтна кожным прадпрыемствам паасобку. Партыйныя арганізацыі абавязаны праяўляць максімум ініцыятывы ў справе выяўлення новых магчымасцей палепшання і развіцця прамысловасці і транспарта.

Далей неабходна, каб партыйныя арганізацыі дапамагалі наркаматам і главкам правяраць работу дырэктараў прадпрыемстваў, **правяраць выкананне рашэнняў наркаматаў прадпрыемствамі.**

Партыйныя кіраўнікі абавязаны зразумець настойлівую неабходнасць карэннага палепшання работы партыйных арганізацый па праверцы выканання рашэнняў у галіне прамысловасці і транспарта. Партыйныя арганізацыі павінны ўясніць сабе, што адны толькі наркаматы не ў сілах кантраліраваць работу прадпрыемстваў, правяраць выкананне рашэнняў наркаматаў. Таму партыйныя арганізацыі павінны дапамагчы наркаматам у справе праверкі выканання дырэктыў наркаматаў прадпрыемствамі, г. зн. у справе кантраліравання работы дырэктараў прадпрыемстваў.

Толькі пры гэтых умовах можна будзе забяспечыць сістэматычнае выкананне дзяржаўных планаў кожным прадпрыемствам, кожнай чыгункай і тым самым рушыць уперад развіццё прамысловасці і транспарта.

Якія-ж меры далей трэба прыняць партыйным арганізацыям, каб ліквідаваць недахопы ў рабоце прамысловасці і транспарта?

АБ УЛІКУ АБСТАЛЯВАННЯ, УСЯКАГА РОДУ МАЁМАСЦІ І МАТЭРЫЯЛАЎ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ. Пачаць трэба з гэтага пытання таму, што многія забываюць, што без правільнага ўліку абсталявання, маёмасці, матэрыялаў нельга ўпраўляць прадпрыемствам. Дырэктар прадпрыемства, калі ён хоча па-сапраўднаму трымаць у руках прадпрыемства і працаваць не ўсляпую, не на авось, павінен добра ведаць усю гаспадарку завода, павінен ведаць, дзе і колькі ёсць на заводзе абсталявання, інструмента, сыравіны, матэрыялаў.

Між тым, як гэта паказваюць многія факты, на прадпрыемствах улік абсталявання, улік матэрыялаў, сыравіны і нават гатовай прадукцыі пастаўлен зусім нездавальняюча. Кіраўнікі прадпрыемстваў дапускаюць існаванне разбухшага штата і многіх злішкаў ва ўліку, а элементарных звестак аб рэсурсах прадпрыемства не маюць.

Вось тыповы факт. Дырэктару Кальчугінскага завода Наркомцветмета тав. Пятрову патрэбавалася даведацца, колькі мелася на 7 студзеня 1941 года незавершанай вытворчасці ў цэху № 2. Бухгалтэрыя завода паведаміла яму — 81,6 тоны, планавы аддзел назваў цыфру ў 47.7 тоны, па кнігах у цэху значылася 51.5 тоны, а пры праверцы фактычна аказалася 11 тон. **(Ажыўленне ў зале).**

Падумайце самі, таварышы, як можа працаваць дырэктар з такім улікам.

Пры цяперашнім становішчы ўліку немудрана, што маюць месца такія, напрыклад, факты. Суды Каспітанкера за 9 месяцаў 1940 года перарасходавалі 12,5 тыс. тон паліва, а наркамат налічыў Каспітанкеру 2 млн. рублёў эканоміі па паліву. Вось якія парадкі ў Наркамаце Марскога Флота. Можна і паліва перапаліць і праслыць эканомным гаспадарнікам. **(Ажыўленне ў зале).**

У рэзультаце запушчанасці ўліку на прадпрыемствах ствараюцца лішнія запасы матэрыялаў, загатаўляецца лішні і, як правіла, некамплектны задзел, павялічваецца незавершаная вытворчасць і амярцвяюцца велізарныя дзяржаўныя сродкі.

Па даных ЦУНХУ на прадпрыемствах 12 прамысловых наркаматаў на 1 снежня 1940 г. запасы таварна-матэрыяльных каштоўнасцей перавышалі ўстаноўленыя нормы захоўвання матэрыяльных каштоўнасцей на 2.610 млн. рублёў.

Дрэнны ўлік прыводзіць да таго, што на прадпрыемствах, будоўлях, на чыгунках не скарыстоўваюцца каштоўнейшыя станкі, машыны і маторы. Вельмі часта бывае так, што пры атрыманні новых заданняў дырэктар прад'яўляе патрабаванне на дадатковую колькасць матэрыялаў, станкоў, абсталявання, у тым ліку і імпартнага, у той час як на прадпрыемствах усё гэта ёсць у дастатковай колькасці. Наркаматы-ж, не ведаючы сапраўднага становішча спраў на прадпрыемствах, замест таго, каб правяраць заяўкі і патрабаванні прадпрыемстваў, звычайна штампуюць іх.

Работа прадпрыемстваў, дзе адсутнічае колькі-небудзь нармальны ўлік, чравата нечаканасцямі. На такіх прадпрыемствах немінучы зрывы вытворчасці ў выніку нечаканай для кіраўніка нястачы той ці іншай сыравіны, матэрыялаў, паўфабрыкатаў, інструментаў. Пры гэтым нястача заўсёды выяўляецца ў той момант, калі ўзнікае патрэбнасць у гэтых матэрыялах і калі неабходна ўжо здаваць гатовую прадукцыю.

Задача заключаецца ў тым, каб пакончыць з запушчанасцю ўліку на нашых прадпрыемствах і чыгунках.

Неабходна, каб прамысловыя прадпрыемствы і чыгункі мелі **правільна пастаўлены ўлік абсталявання, усякага роду маёмасці і матэрыялаў.**

АБ СКАРЫСТАННІ АБСТАЛЯВАННЯ, ІНСТРУМЕНТА, СЫРАВІНЫ, МАТЭРЫЯЛАЎ. Ясна, таварышы, што правільнае скарыстанне абсталявання, інструмента, матэрыялаў, сыравіны і паліва рашае вытворчы поспех прадпрыемства.

Між тым, вытворчая магутнасць абсталявання нашых прамысловых прадпрыемстваў скарыстоўваецца далёка не поўнасцю, інструментальная гаспадарка на многіх прадпрыемствах запушчана, дрэнна і неэканомна расходуюцца матэрыялы, сыравіна і паліва. Нямала станкоў і іншага абсталявання прастойвае на прадпрыемствах, а часам і проста ляжыць на складах гэтых прадпрыемстваў, у той час, калі на іншых прадпрыемствах адчуваецца вострая патрэба ў гэтым абсталяванні.

Па даных ЦУНХУ на 1 лістапада 1940 года па 8-мі прамысловых наркаматах, — а гэтыя даныя далёка не поўныя, — 33 тысячы металарэжучых станкоў, якія ёсць на прадпрыемствах, не былі ўстаноўлены і, значыцца, не працавалі. Апрача таго, на прадпрыемствах гэтых-жа 8-мі наркаматаў 6 тысяч адзінак кузнечна-прэсавага абсталявання таксама не былі ўстаноўлены і, значыцца, бяздзейнічалі.

Па тых-жа даных ЦУНХУ на 7.629 прадпрыемствах краіны мелася 170 тысяч неўстаноўленых электраматораў, з агульнай магутнасцю ў 2 мільёны кілават і 4,522 неўстаноўленых электрагенератары з агульнай магутнасцю ў 340 тысяч кілават.

Хіба можна, таварышы, далей цярпець такую абураючую безгаспадарчасць?

Наколькі недапушчальна скарыстоўваюцца вытворчыя магутнасці на нашых прадпрыемствах, можна паказаць яшчэ на прыкладах цэментнай і лясной прамысловасці.

Вытворчая магутнасць цэментнай прамысловасці з года ў год павышаецца. У 1936 г. вытворчая магутнасць усіх цэментных заводаў складала 6.701 тысячу тон, у 1937 г.—7.024 тысячы тон, у 1938 г. — 7.604 тысячы тон, у 1939 г. — 7.976 тысяч тон і ў 1940 годзе — 8.206 тысяч тон. Між тым, скарыстоўванне гэтых магутнасцей за гэтыя годы сістэматычна змяншалася. Так, калі вытворчая магутнасць цэментных заводаў у 1936 г. была скарыстана на 88 процантаў, што вельмі дрэнна, то ў 1937 годзе гэтая магутнасць была скарыстана яшчэ горш, толькі на 77 процантаў, у 1938 годзе—на 75 процантаў, у 1939 годзе—на 65 процантаў, а ў 1940 годзе — усяго толькі на 64 проценты

А цэмент-жа, таварышы, здаецца, не апошнюю ролю адыгрывае ў нашым капітальным будаўніцтве.

Або вось лясная прамысловасць. На 1 студзеня 1939 года Наркамлес СССР меў лесапільныя рамы агульнай вытворчай магутнасцю па выпуску піламатэрыялаў на 31,5 млн. кубаметраў, фактычна-ж выпрацавана ў 1940 годзе толькі 13 млн. кубаметраў піламатэрыялаў, што складае ўсяго толькі 41 процант вытворчай магутнасці лясной прамысловасці па выпуску піламатэрыялаў.

А лес-жа таксама вельмі і вельмі патрэбен нашай прамысловасці і транспарту.

Бывае часта і так, што дэфіцытнае кваліфікаванае абсталяванне, складаныя вытворчыя агрэгаты, буйныя станкі скарыстоўваюцца не па прызначэнню або з няпоўнай нагрузкай. На такім дэфіцытным кваліфікаваным абсталяванні выконваюць простыя аперацыі або апрацоўваюць дробныя дэталі, якія разумней было-б рабіць на больш простым і дробным абсталяванні. Нярэдка бывае так, што на велізарным карусельным станку апрацоўваецца дэталь з чайны спадачак велічынёй.

Такога роду неэканомнае скарыстанне абсталявання зніжае фактычныя вытворчыя магчымасці нашых прадпрыемстваў і наносіць велізарныя страты ўсёй народнай гаспадарцы.

Са скарыстаннем інструмента абстаіць справа таксама вельмі дрэнна. На прадпрыемствах інструмент скарыстоўваецца няправільна. Дарагакаштуючы інструмент ужываецца не па прызначэнню. Часта здаецца ў лом інструмент, які быў ва ўжыванні, між тым як ён можа быць адноўлен і зноў скарыстан.

Што-ж датычыць матэрыялаў, сыравіны і паліва, то тут у нас проста-такі злачыннае марнатраўства. У выніку лішніх прыпускоў ліцця і паковак многа метала ідзе ў стружку. У сваю чаргу стружка, у тым ліку і стружка рэдкіх металаў, скарыстоўваецца не поўнасцю. Многа матэрыялаў прападае з-за няправільнага і неэканомнага раскрою і загатоўкі. Пракат выпрабляецца ў недастаткова шырокім сартыменце, у выніку чаго метал расходуецца залішне.

На нашых прадпрыемствах і чыгунках да гэтага часу вялікі перажогі паліва і перарасход электраэнергіі. Марнатраўна расходуецца вадкае паліва там, дзе яно можа быць з поспехам заменена цвёрдым палівам.

Задача заключаецца ў тым, каб пакончыць з безгаспадарчасцю ў скарыстанні абсталявання, з марнатраўствам у расходаванні інструмента, сыравіны, матэрыялаў, паліва і электраэнергіі, пакончыць з такім становішчам, калі ў нашай прамысловасці і на транспарце не поўнасцю скарыстоўваюцца вытворчыя магутнасці.

Неабходна, каб на нашых прамысловых прадпрыемствах і чыгунках поўнасцю **і правільна скарыстоўвалася абсталяванне і гаспадарча расходваліся інструмент, сыравіна, матэрыялы, паліва, электраэнергія.**

АБ ЗАХОЎВАННІ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ ДЗЯРЖАЎНАЙ МАЁМАСЦІ. Клопаты аб захоўванні дзяржаўнай маёмасці — збудаванняў, будынкаў, абсталявання, інструмента і ўсіх матэрыяльных каштоўнасцей, давераных прадпрыемствам,— з'яўляюцца пярвейшым абавязкам кіраўнікоў, інжынераў, рабочых і служачых нашых фабрык, заводаў, чыгунак і воднага транспарта. Гэта не разумеюць многія работнікі прадпрыемстваў і праяўляюць на кожным кроку нядбайныя і негаспадарчыя адносіны да народнага дабра.

На многіх прадпрыемствах абсталяванне, сыравіна, матэрыялы, інструмент, у якіх востра адчувае патрэбу наша прамысловасць, валяюцца дзе папала, псуюцца, ржавеюць, прыходзяць у нягоднасць.

Факты наконт гэтага вы можаце, таварышы, знайсці на прадпрыемствах сваёй вобласці і горада.

Таварышам з Варонежскай вобласці магу дапамагчы ў гэтай справе.

На заводзе № 61 у г. Ліпецку 14 студзеня 1941 года ў снягу, пад адкрытым небам, сярод хламу было выпадкова знойдзена 70 годных станкоў. А на гэтым-жа заводзе ёсць дырэктар, ёсць партыйная арганізацыя, нарэшце, у Ліпецку ёсць і гарком партыі. Чаго-ж яны глядзяць? Дзе-ж тут клопаты аб захоўванні абсталявання?

Хіба гэта не злачынныя адносіны да дзяржаўнага дабра?

Няма чаго ўжо і гаварыць аб тым, што на нашых прадпрыемствах шырока распаўсюджаны нядбайныя і неахайныя адносіны да свайго станка, да свайго інструмента. А зусім-жа відавочна, што дрэнны догляд за станкамі і інструментам, несвоечасовы і недобраякасны рамонт абсталявання, будынкаў заўчасна разбурае і выводзіць іх са строю.

На транспарце запушчанасць рамонту рухомага састава і нядбайнае ўтрыманне чыгунак і водных шляхоў з'яўляюцца сур'ёзнымі прычынамі аварый.

Задача заключаецца ў тым, каб пакончыць з такімі праяўленнямі антыдзяржаўных адносін да народнага дабра.

Неабходна дабіцца, каб на прамысловых прадпрыемствах і на транспарце ўсе **матэрыяльныя каштоўнасці ўтрымліваліся ў цэласці і добрым стане,** каб кіраўнікі прадпрыемстваў бераглі даверануюю ім дзяржаўную маёмасць — будынкі, абсталяванне, інструмент, матэрыялы.

АБ ЗАБАРОНЕ ПРОДАЖУ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ АБСТАЛЯВАННЯ І МАТЭРЫЯЛАЎ. Па гэтаму пытанню, таварышы, гэтымі днямі выдан Указ. Чым выклікан гэты Указ? Ён выклікан тым, што на нашых прадпрыемствах мае месца разбазарванне абсталявання і матэрыялаў шляхам іх продажу і абмену з іншымі прадпрыемствамі. Дзяржава адпускае прадпрыемствам для пэўных мэт абсталяванне і матэрыялы, а кіраўнікі прадпрыемстваў самавольна і незаконна распараджаюцца імі, прадаюць, абменьваюць і адпускаюць на старану.

Факты продажу, разбазарвання дзяржаўнай маёмасці вы можаце выявіць, таварышы, у сябе ў абласцях і гарадах на многіх прадпрыемствах.

Вось, напрыклад, у Данбасе, у горадзе Сталіно металургічны завод у 1940 годзе незаконна адпусціў розных заводскіх матэрыялаў Корсунскай тэкстыльнай фабрыцы, Сталінскаму харчгандлю і драматычнаму тэатру на суму звыш поўмільёна рублёў.

Трэба запытаць, хто дазволіў дырэктару гэтага завода так абыходзіцца з давераным яму дзяржаўным дабром?

Або вось на Омскай чыгунцы мелі месца факты продажу на старану кровельнага жалеза, цвікоў, аліфы, круглага лесу і іншых матэрыялаў.

Якое права мае на гэта начальнік Омскай чыгункі?

Сярэдне-Уральскі медзеплавільны завод у Свярдлоўскай вобласці ў 1940 годзе прадаў канторы «Цветметснаб» водаарматуры на 100 тысяч рублёў. Але тут вышаў такі кур'ёз. У той час, як дырэктар прадаваў гэтую арматуру, так званы адказны выканаўца гэтага-ж завода шукаў усякага роду матэрыялы і абсталяванне для гэтага завода. У пошуках ён зайшоў на склад «Цветметснаба» і ўбачыў там водаарматуру, якая паказалася яму падыходзячай. Не ведаючы, што гэтая арматура была толькі-што прадана з іх завода, адказны выканаўца купіў яе і прывёз на завод, заплаціўшы ўжо 111 тысяч рублёў. **(Смех).**

Можна сабе ўявіць, таварышы, якія парадкі на гэтым заводзе. Па-сапраўднаму на такіх, з дазволу сказаць, «аперацыях» дырэктар павінен быў-бы прагарэць, але паколькі ў нашых наркаматах прынята ўсе падобныя благаглупствы адносіць на казённы кошт, то дырэктар адчувае сябе спакойна. Мабыць нават гэты дырэктар за ўдачны продаж, а адказны выканаўца за ўдачную пакупку атрымалі прэміі. **(Агульны смех).**

Запарожскі завод ферасплаваў адпусціў Орэхава-Зуеўскаму механічнаму заводу «Главдзяржбавоўнпрома» кокс і алсевы фера-сіліцыя. У абмен на гэтыя матэрыялы Орэхава-Зуеўскі механічны завод адпусціў Запарожскаму заводу ферасплаваў мануфактуру. На запісцы дырэктара завода т. Філатава па гэтаму повадзу начальнік «Главспецсталі» т. Шарамецьеў наклаў наступную рэзалюцыю: «Згодзен, хоць гэта няправільна. У далейшым рабіць забараняю». **(Смех).**

Гавораць, што кіраўнікі завода, падбадзёраныя такой рэзалюцыяй, неўзабаве аднавілі розныя абменныя аперацыі.

Трэба прама сказаць, таварышы, што ўстанавіўшаяся практыка продажу так званага дэмантыруемага і лішняга абсталявання і матэрыялаў з'яўляецца ні чым іншым, як раскраданнем сацыялістычнай уласнасці.

Задача заключаецца ў тым, каб строга праводзіць у жыццё Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 лютага 1941 года «Аб забароне продажу, абмену і водпуску на старану абсталявання і матэрыялаў і аб адказнасці па суду за гэтыя незаконныя дзеянні».

Неабходна **пакончыць з устанавіўшайся на многіх прадпрыемствах і чыгунках практыкай продажу так званага дэмантыруемага і лішняга абсталявання і матэрыялаў,** што з'яўляецца ні чым іншым, як раскраданнем сацыялістычнай уласнасці.

АБ ЧЫСТАЦЕ І ПАРАДКУ У ПРАДПРЫЕМСТВАХ І НА ЧЫГУНКАХ. Здаецца зусім ясным, што чыстата з'яўляецца самай элементарнай умовай нармальнай работы сучаснага прадпрыемства.

Абсталяванне, за якім не даглядаюць, якое не ўтрымліваюць у належнай чыстаце і парадку, часта адмаўляе ў рабоце. Аварыі і катастрофы немінучы там, дзе няма чыстаты і парадку. Работа на брудным, няспраўным абсталяванні, карыстанне няспраўным інструментам выклікае брак прадукцыі.

Гразь — немінучы спадарожнік і крыніца расхлябанасці, расхістанасці дысцыпліны, разбоўтанасці, адсутнасці парадку на заводзе.

Бескультур'е, захламленасць, пануючыя на многіх прадпрыемствах, перашкаджаюць арганізаваць працу рабочых, майстроў, інжынераў, перашкаджаюць ім прадукцыйна скарыстаць рабочы час. Усё гэта прыводзіць да таго, што зніжаецца вытворчая магутнасць прадпрыемстваў, змяншаецца выпуск прадукцыі і пагаршаецца яе якасць.

А між тым, на многіх нашых прадпрыемствах, у цэхах і на тэрыторыі заводскіх двароў, у дэпо, у чыгуначных майстэрнях, на электрастанцыях, на вакзалах, у марскіх і рачных портах пануе гразь. Рабочыя месцы, абсталяванне, інструмент і сыравіна ўтрымліваюцца неахайна. Каля станкоў і ў праходах валяюцца жалезны лом і стружка. Вокны і шкляныя дахі цэхаў запылены і дрэнна прапускаюць святло.

Вось вам прыклад. Ёсць такі вядомы ўсёй краіне Магнітагорскі завод. Дык вось на гэтым заводзе цэхі захламлены. У асаблівасці мартэнаўскі і пракатны цэхі. Гавораць, што за мартэнаўскай печчу № 12 ляжыць куча ўсякага хламу, для вывазкі якога трэба падаць многа вагонаў парожняка. На пралёце паміж першым і другім мартэнаўскімі цэхамі існуе так званая спрэчная тэрыторыя, г. зн. і адзін і другі цэхі не прызнаюць гэту тэрыторыю сваёй. Як-жа вырашаецца спрэчка ў Магнітагорску? Аказваецца, вырашаецца «выгадна» для абодвух цэхаў. Абодва цэхі скідваюць на гэту тэрыторыю смецце і ні адзін з іх не ўбірае яго. Прыйдзецца таварышам магнітагорцам, відаць, тут на канферэнцыі вырашыць спрэчку паміж гэтымі цэхамі, бо гарадскі камітэт партыі не знайшоў часу разабрацца ў гэтай справе да канферэнцыі. Гавораць, што кіруючыя работнікі Магнітагорскага гаркома бываюць у цэхах і быццам-бы пры гэтым яны трацяць не мала намаганняў на тое, каб прабрацца ў цэхі, бо ім прыходзіцца ўзбірацца на горы акаліны і спатыкацца аб розны хлам і смецце.

Ці да твару магнітагорцам лічыць гразь і захламленасць абавязковым спадарожнікам такога першакласна абсталяванага завода, якім з'яўляецца Магнітагорскі?

Або вось Кальчугінскі завод Наркомцветмета ў Іванаўскай вобласці, аб якім ужо ішла гутарка. На гэтым заводзе з-за гразі і захламленасці ў цэхах часта ў пракатваемыя вырабы пападае пастаронні метал або кавалкі гразі, прыліпаючыя да метала, які ляжыць на бруднай падлозе. Гэты брак атрымаў на заводзе нават асобае найменаванне—«закат гразі». Толькі за лістапад 1940 года ў цэху № 4 было складзена 870 актаў на брак, з іх 136 актаў на брак па так званаму «закату гразі». За год страты ад браку па гэтаму цэху перавышаюць 300 тысяч рублёў.

Хто даў права кальчугінцам так засмеціць савецкі завод?

Або вось вазьміце ў Маскве Савелаўскі вакзал. Гэты вакзал знаходзіцца ў запушчаным і некультурным стане. Столі ад працякаўшай вады пакрыліся цёмнымі, бруднымі кругамі, плесенню. Ад таючага лёду з вокнаў цячэ вада на падлогу. Абрусы на сталах у буфеце брудныя. У памяшканні вакзала рамантаваўся адзін маленькі пакойчык. І вось ад яго пацягнецца дарожка бруду па ўсяму вакзалу. У зале прыгарадных кас на падлозе бруд і раскіданы акуркі.

Хіба можна далей цярпець такое бескультур'е? Дырэктары заводаў, начальнікі дэпо, начальнікі вакзалаў абавязаны навесці чыстату на сваіх прадпрыемствах і пастаянна падтрымліваць яе. З іх, з дырэктараў, трэба патрабаваць адказнасці за ўсе гэтыя агіднасці. Адказвае дырэктар, а ён павінен умець трэбаваць з начальнікаў цэхаў.

Хіба нельга завесці такі парадак, каб адзін дзяжурны па змене, прымаючы змену, а другі, здаючы яе, сачылі за тым, у якім стане цэхі знаходзяцца ў сэнсе чыстаты.

Нельга далей цярпець захламленасць і гразь на нашых заводах, шахтах, дэпо, вакзалах, у портах. Пара пакласці канец бескультур'ю на прадпрыемствах. Нядбайныя, безгаспадарчыя адносіны да народнага дабра наносяць велізарныя страты дзяржаве.

Ленін не раз кляйміў з'явы безгаспадарчасці, расхлябанасці, гразі, бескультур'я. Ленін гаварыў, што мы не здолеем выканаць свайго абавязку, не ведучы **вайны** супроць гэтых ахоўнікаў традыцый капіталізма. «Мы не комуністы, — падкрэсліваў Ленін, — а трапачнікі, пакуль мы, моўчкі, церпім такія фабрыкі».

Неабходна навесці і штодзённа падтрымліваць **чыстату і элементарны парадак у** прадпрыемствах і на чыгунках.

Задачу падтрымання чыстаты і культуры на вытворчасці мы абавязаны вырашыць неадкладна, як самую простую і элементарную, але ў той-жа час не церпячую ніякіх адтэрміновак, бо без элементарнай культуры нельга паспяхова выканаць задачу далейшага ўздыму нашай прамысловасці, без элементарнай культуры нельга вырашаць вялікія стаячыя перад нашай краінай задачы, звязаныя з пераходам ад сацыялізма да комунізма.

Савецкі завод павінен быць рассаднікам чыстаты і парадку.

АБ ГРАФІКУ ВЫКАНАННЯ ПРАДПРЫЕМСТВАМ ВЫТВОРЧАЙ ПРАГРАМЫ. Зараз, таварышы, справа абстаіць так, што выпуск гатовай прадукцыі на большасці прадпрыемстваў адбываецца нераўнамерна, рыўкамі і, як правіла, сканцэнтроўваецца к канцу месяца. На прадпрыемствах адсутнічае загадзя распрацаваны цвёрды графік выпуску гатовай прадукцыі.

Вось вам тыповыя прыклады.

Каломенскі машынабудаўнічы завод Маскоўскай вобласці ў 1940 годзе працаваў наступным чынам: у першай дэкадзе кожнага месяца выпускаў 5—7 проц. прадукцыі, у другой дэкадзе—10—15 проц., а ў трэцяй дэкадзе — 75—80 проц.

Ленінградскі завод імені Карла Маркса выпусціў за першую дэкаду снежня 1940 года 2 проценты месячнай прадукцыі, за другую дэкаду — 8 процантаў, а за трэцюю дэкаду — 90 процантаў.

На Маскоўскім насосна-кампрэсарным заводзе ў снежні 1940 года выпуск прадукцыі склаў у першай дэкадзе снежня— 3,4 процанта месячнага плана, у другой дэкадзе — 27,5 процанта і ў трэцяй дэкадзе — 69,1 процанта.

На большасці прадпрыемстваў мы маем такую карціну. Цэхі па выпуску гатовай прадукцыі, зборачныя цэхі атрымліваюць паўфабрыкаты з другіх цэхаў з перабоямі, нераўнамерна. Прадпрыемствы працуюць без нармальнага задзелу, і, як правіла, у першую палавіну месяца ўсе сілы прадпрыемства кідаюцца на стварэнне задзелу.

Такі няправільны рэжым у рабоце прыводзіць да пастаянных аўралаў, да прастояў абсталявання, прастояў рабочай сілы, да недаскарыстання вытворчых магутнасцей, да павелічэння браку, да непрадукцыйных пераплат за звыштэрміновыя работы. Такі няправільны рэжым трымае прадпрыемствы ў ліхарадачным стане і ставіць пад пастаянную пагрозу зрыву выкананне імі дзяржаўнага плана.

Неабходна **пакончыць** з бясплановасцю, **з нераўнамерным выпускам прадукцыі,** са штурмаўшчынай у рабоце прадпрыемстваў і дабіцца штодзённага, па загадзя распрацаванаму графіку, выканання вытворчай праграмы кожным заводам, фабрыкай, шахтай, чыгункай.

У некаторых наркаматах пачынае ўводзіцца добры парадак, згодна якога дырэктары заводаў штодзённа паведамляюць наркому, колькі выпушчана гатовай прадукцыі за папярэдні дзень. Такога роду да-

Працяг на 3-й стар.

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б)

Аб задачах партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

Даклад тав. Г. М. МАЛЕНКОВА

нясенні, у якіх указваецца ўсяго толькі адна цыфра. даюць магчымасць кантраліраваць работу заводаў за кожны дзень. Па іх відаць, на якіх заводах адбыліся адхіленні ад заданага графіка выпуску прадукцыі. Такія данясенні абавязваюць наркома своечасова высняць прычыны невыканання штодзённага задання і своечасова прымаць меры па выпраўленню выяўленых недахопаў.

Штодзённыя данясенні там, дзе яны ўведзены, ужо зараз адыгрываюць вялікую ролю ў кантролі за работай заводаў. Калі раней такія заводы асноўную масу прадукцыі выпускалі ў канцы месяца, то зараз многія з іх пачынаюць працаваць па графіку і штодзённа выпускаць зададзеную колькасць прадукцыі.

Чаму-б, таварышы, ва ўсіх нашых наркаматах не завесці такі-ж парадак і не арганізаваць штодзённы кантроль за работай прадпрыемстваў? Бо ў поўнай меры можна паставіць справу так, каб народны камісар, прышоўшы раніцою на работу, атрымліваў кароткую даведку аб колькасці прадукцыі, выпушчанай заводамі за прайшоўшы дзень.

АБ ТЭХНАЛАГІЧНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ. Буйнейшым недахопам у рабоце нашых прадпрыемстваў з'яўляецца слабасць тэхналагічнай дысцыпліны, адсутнасць дэтальна распрацаванай тэхналогіі вытворчасці, самавольнае адступленне ад зацверджаных чарцяжоў і безадказнае змяненне канструкцый без папярэдніх дакладных выпрабаванняў. На многіх заводах устаноўлены тэхналагічны рэжым вытворчасці самавольна нарушаецца, мяняецца метад апрацоўкі, не захоўваюцца ўстаноўленыя размеры допускаў.

Дырэктары заводаў, галоўныя інжынеры і галоўныя тэхнолагі дрэнна кантралююць выкананне тэхналагічных інструкцый, не сочаць за дакладным захоўваннем чарцяжоў, перадавяраюць адказнейшую справу зацвярджэння тэхналагічнай дакументацыі і чарцяжоў другарадным работнікам.

Іменна, у сувязі з гэтым, дакументацыя і чарцяжы вырабаў, па якіх павінен весціся тэхналагічны працэс, знаходзяцца часта ў хаатычным стане, а тэхналогія вытворчасці, запісаная ў дакументах, разыходзіцца з тым, як яна фактычна праводзіцца на рабочых месцах.

Падобныя лёгкамысленыя адносіны да захоўвання тэхналагічнай дысцыпліны, да дакладнасці захоўвання чарцяжоў і канструкцый прыводзяць да таго, што ў серыйнай вытворчасці выпускаецца прадукцыя не аднолькавай якасці, стандартныя дэталі машын і механізмаў атрымліваюцца не ўзаемазамяняемымі. Самавольства ў змяненнях тэхналогіі і ў чарцяжах прыводзіць часта да выпуску нягоднай прадукцыі і да загрузкі абсталявання непатрэбнай работай.

Іменна з-за адсутнасці тэхналагічнай дысцыпліны на многіх нашых прамысловых прадпрыемствах усё яшчэ прадаўжаецца выпуск няздобраякаснай і некамплектнай прадукцыі, не адпавядаючай устаноўленым стандартам.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 ліпеня 1940 года «Аб адказнасці за выпуск нядобраякаснай або некамплектнай прадукцыі і за незахоўванне абавязковых стандартаў прамысловымі прадпрыемствамі», хоць і аказаў сваё дзеянне, аднак, у справе барацьбы за якасць прадукцыі ў нас яшчэ ёсць многа недахопаў.

Многія гаспадарчыя кіраўнікі злачынна лёгкамыслена адносяцца да фактаў выпуску нядобраякаснай прадукцыі, да фактаў псавання бракаробамі вялікай колькасці матэрыяльных каштоўнасцей. Бракаробы не нясуць матэрыяльнай адказнасці за зроблены імі брак.

Выпуск нядобраякаснай сыравіны, бракаванай прадукцыі зрывае выкананне вытворчых планаў, зрывае нармальную работу нашых прадпрыемстваў і рэзка павышае сабекошт вырабаў. На многіх прадпрыемствах адсутнічае своечасовы і апаратыўны кантроль, які папярэджвае магчымасць узнікнення браку.

Пара пакончыць, таварышы, з нарушэннямі тэхналогіі. Неабходна на ўсіх прадпрыемствах увесці дакладныя інструкцыі тэхналагічных працэсаў і ўстанавіць кантроль за захоўваннем гэтых інструкцый. Наркаматы абавязаны забяспечыць найстражэйшую дысцыпліну ў захоўванні тэхналагічнага працэса вытворчасці на прадпрыемствах і забараніць прадпрыемствам без дазволу наркаматаў змяняць устанавіўшуюся ў масавай і серыйнай вытворчасці тэхналогію і ўносіць змяненні ў канструкцыях і чарцяжах вырабаў устанавіўшайся вытворчасці.

Работнікам нашых прадпрыемстваў і наркаматаў пара зразумець, што цяпер ужо нельга працаваць па-старынцы, уразвалку, абыяк, навока. Новыя дакладныя механізмы, якімі аснашчоны нашы прадпрыемствы, патрабуюць, каб у вытворчасці быў найстражэйшы парадак, каб уся работа была аснавана на дакладным захоўванні тэхнічных правіл і інструкцый.

Сутнасць дысцыпліны ў тэхналогіі павінна заключацца ў тым, каб нашы рабочыя, майстры і інжынеры навучыліся дакладна, без адступлення паўтараць тэхналагічную аперацыю і выпускаць, згодна патрабаванняў тэхнічных умоў і стандартаў, прадукцыю у дакладнасці падобную адна на другую.

Кожнае наша прамысловае прадпрыемства павінна выпускаць прадукцыю добрай якасці і высока трымаць чэсць сваёй фабрычнай, заводскай маркі.

Неабходна, таварышы, дабіцца на нашых прадпрыемствах захоўвання **найстражэйшай дысцыпліны ў тэхналагічным працэсе,** увесці на ўсіх прадпрыемствах дакладныя інструкцыі тэхналагічных працэсаў, устанавіць кантроль за іх захоўваннем **і забяспечыць, такім чынам, выпуск добраякаснай і камплектнай прадукцыі,** поўнасцю адпавядаючай устаноўленым стандартам.

ПЫТАННІ НОВАЙ ТЭХНІКІ. Многія кіраўнікі прадпрыемстваў прамысловасці і транспарта недаацэньваюць значэння новай тэхнікі, не працуюць над далейшым яе ўдасканаленнем, над асваеннем вытворчасці новых машын, матэрыялаў і вырабаў. Каштоўнейшыя вынаходствы і ўдасканаленні часта гадамі ляжаць у навукова-даследчых інстытутах, лабараторыях, на прадпрыемствах і астаюцца нескарыстанымі ў вытворчасці.

Тэхнічныя советы ва многіх наркаматах ператварыліся ў падсобныя органы па дачы заключэнняў па дробных тэхнічных пытаннях і не займаюцца па-сапраўднаму пытаннямі ўнядрэння новай тэхнікі.

Некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў, зыходзячы са сваіх выгод, лічаць за лепшае гадамі вырабляць адну і тую-ж старую прадукцыю, гадамі трымацца на старых метадах вытворчасці, не гледзячы на развіццё тэхнікі.

Праектыраванне і канструіраванне новых відаў прадукцыі, як і асваенне іх у серыйнай вытворчасці, праходзіць марудна і займае працяглы час. У рэзультаце гэтага нярэдка мае месца такое становішча, што серыйны выпуск новай прадукцыі пачынаецца тады, калі гэта прадукцыя аказваецца ўжо далёка не перадавой.

Многія таленавітыя канструктары не атрымліваюць з боку наркаматаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў неабходнага падтрымання, у выніку чаго яны не мала трацяць марна сіл і энергіі. Між тым, як гэта паказвае вопыт, калі нашым канструктарам даюць канкрэтныя заданні па распрацоўцы тых ці іншых пытанняў, то яны добра спраўляюцца з пастаўленымі перад імі задачамі.

Перадавыя метады вытворчасці, вопыт перадавых прадпрыемстваў, цэхаў, лепшых стаханаўцаў, наватараў вытворчасці ўнядраюцца павольна, а ў радзе выпадкаў нават ігнарыруюцца.

Такі кансерватызм часткі кіраўнікоў прадпрыемстваў перашкаджае далейшаму развіццю вытворчасці, асуджае прадпрыемствы на адсталасць і гібенне, падрывае абаронную магутнасць краіны.

Трэба пакласці канец хвасцізмам, у корані апартуністычным адносінам да новай тэхнікі.

Задача заключаецца ў тым, каб кіраўнікі прадпрыемстваў, канструктары, работнікі навукова-даследчых інстытутаў і лабараторый, інжынеры тэхнікі, майстры, перадавыя рабочыя нястомна працавалі над удасканаленнем тэхнікі, над асваеннем вытворчасці новых машын, матэрыялаў і вырабаў.

Нашы работнікі прамысловасці і транспарта абавязаны поўнасцю скарыстаць велізарныя магчымасці социялістычнага ладу для росквіту тэхнічнай мыслі і для хутчэйшага ўнядрэння новых дасягненняў тэхнікі ў вытворчасць. Неабходна асобую ўвагу ўдзяляць пытанням новай тэхнікі, нястомна **працаваць над удасканаленнем тэхнікі, над асваеннем вытворчасці новых машын, матэрыялаў і вырабаў.**

АБ САБЕКОШЦЕ ВЫПУСКАЕМАЙ ПРАДУКЦЫІ. Многія факты, таварышы, паказваюць, што кіраўнікі прадпрыемстваў прамысловасці і транспарта перасталі пагаспадарску лічыць, калькуліраваць, берагчы народную капейку.

Вялікія страты церпяць нашы прадпрыемствы ў выніку пережогу паліва, непрадукцыйнага расходвання сыравіны, вялікіх адыходаў каштоўнейшых матэрыялаў, неэканомнага расходу электраэнергіі. Такое марнатраўнае вядзенне гаспадаркі антынародна. Яно нічога агульнага не мае з нашай социялістычнай гаспадаркай, дзе павінны быць на самым строгім уліку, павінны быць прадукцыйна скарыстаны кожная капейка, кожны кілограм паліва, сыравіны, кожны агрэгат і станок.

Кіраўнікі многіх прадпрыемстваў прывыклі да таго, што ім усё даецца ў гатовым выглядзе, забылі аб гаспадарчым разліку, зжыліся з нарушэннямі фінансавай дысцыпліны, зжыліся з безгаспадарчасцю і раўнадушна адносяцца да таго, што за матэрыяльныя страты, нанесеныя імі ў рэзультаце дрэннага гаспадарання, расплачваецца дзяржава.

Сабекошт прадукцыі — асноўны паказальнік, які характарызуе якасць усёй работы прадпрыемства. Каб правільна кіраваць работай прадпрыемстваў, трэба ведаць фактычныя расходы на адзінку вырабу па асноўных элементах сабекошту—заработная плата, кошт сыравіны, паліва і электраэнергіі, амартызацыйныя налічэнні, адміністрацыйна-ўпраўленчыя расходы і накіроўваць эканамічны бок дзейнасці прадпрыемства так, каб планы па сабекошту і па прыбытках безумоўна выконваліся.

Задача заключаецца ў тым, каб пакончыць з безгаспадарчым вядзеннем справы, аўладаць эканамічным бокам дзейнасці прадпрыемства, максімальна скарыстаць унутраныя рэсурсы прадпрыемства.

Неабходна сістэматычна зніжаць сабекошт выпускаемай прадукцыі, усяляк умацоўваць гаспадарчы разлік, рашуча выкарчоўваць марнатраўства.

ПЫТАННІ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ. Таварышы, правільная арганізацыя заработнай платы з'яўляецца важнейшай умовай росту вытворчасці. Кіруючым прынцыпам ва ўсёй нашай палітыцы ў галіне заработнай платы з'яўляецца прынцып матэрыяльнай зацікаўленасці працоўных у рэзультатах працы. Гэты прынцып ажыццяўляецца ў нас у выглядзе здзельнай сістэмы аплаты для рабочых, прэміяльнай сістэмы для кіруючых работнікаў і ў выглядзе заахвочвання кваліфікаванай працы параўнальна з некваліфікаванай.

Здзельшчына і прэміяльная сістэма з'яўляюцца важнейшымі рычагамі ў справе павышэння прадукцыйнасці працы, а значыцца і развіцця ўсёй нашай народнай гаспадаркі.

На практыцы ў галіне заработнай платы гэты кіруючы прынцып нарушаецца нярэдка. Часта мае месца гнілая практыка, якая заключаецца ў тым, што ўслед за заахвочваннем добра працуючых да іх узроўню заработнай платы штучна падцягваецца заработная плата і тых груп рабочых, якія адстаюць у прадукцыйнасці працы, не павышаюць сваёй кваліфікацыі і не выконваюць норм выпрацоўкі.

Бывае і так, як гэта мела месца да апошняга часу ў вугальнай прамысловасці, а можа быць ёсць на некаторых вугальных шахтах яшчэ і зараз, калі працуючыя на падземных работах атрымлівалі менш, чым працуючыя на паверхневых работах.

Іменна ў рэзультаце гэтых недахопаў у арганізацыі заработнай платы да гэтага часу на нашых прадпрыемствах існуе немалая праслойка рабочых, якія не выконваюць норм выпрацоўкі. Такому становішчу патураюць кіраўнікі і майстры на многіх прадпрыемствах, якія заахвочваюць ураўнілаўку ў заработнай плаце і тым самым стрымліваюць далейшы рост прадукцыйнасці працы. Кіраўнікі прадпрыемстваў і майстры часта ўхіляюцца ад павышэння норм выпрацоўкі нават тады, калі гэтага настойліва патрабуюць прымяненне перадавой тэхнікі і арганізацыйна-гаспадарчыя мерапрыемствы.

Задача заключаецца ў тым, каб заахвочваць добра працуючых і да канца ліквідаваць гнілую практыку ўраўнілаўкі ў галіне заработнай платы. Кіраўнікі прадпрыемстваў, начальнікі цэхаў і майстры абавязаны ажыццяўляць павышэнне норм выпрацоўкі па меры ўвядзення перадавой тэхнікі і арганізацыйна-гаспадарчых мерапрыемстваў.

Неабходна, таварышы, **у галіне заработнай платы строга і паслядоўна праводзіць прынцып матэрыяльнага заахвочвання добра працуючых,** які ажыццяўляецца ў выглядзе здзельнай сістэмы аплаты для рабочых, прэміяльнай сістэмы для кіруючых работнікаў і ў выглядзе большай аплаты кваліфікаванай працы параўнальна з некваліфікаванай.

АБ ПРАГУЛАХ І САМАВОЛЬНЫХ УХОДАХ. Правядзенне ў жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года «Аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, на сямідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага ўходу рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў» значна палепшыла становішча працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах.

Аднак, таварышы, прагулы на многіх фабрыках, заводах, рудніках, шахтах, чыгунках яшчэ далёка не спыніліся. Частка кіраўнікоў гаспадарчых, партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый на прадпрыемствах дрэнна вядуць работу па ўмацаванню працоўнай дысцыпліны. Такія кіраўнікі ўспрынялі задачу барацьбы з цякучасцю рабочай сілы і прагуламі, як кароткатэрміновую кампанію, і забылі аб тым, што прагулы і самавольныя ўходы наносяць велізарную шкоду дзяржаве, зрываюць выкананне вытворчых планаў, скарачаюць выпуск прамысловай прадукцыі. Прагулы—гэта біч вытворчасці.

Неабходна, таварышы, **поўнасцю ліквідаваць прагулы.**

АБ АДЗІНАНАЧАЛЛІ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ. Не гледзячы на ясныя дырэктывы партыі, на многіх прадпрыемствах да гэтага часу не ўстаноўлена сапраўднага адзінаначалля ва ўпраўленні прадпрыемствам. Загады дырэктараў нярэдка не выконваюцца. Самі дырэктары прадпрыемстваў не скарыстоўваюць прадастаўленых ім правоў і часта хаваюцца за спіны грамадскіх арганізацый.

Дырэктар прадпрыемства цалкам адказвае за стан прадпрыемства і за парадак на прадпрыемстве, і яго распараджэнні павінны выконвацца. Дырэктар адказвае не толькі за правільнасць адданага распараджэння, але таксама і за тое, каб гэтае распараджэнне было своечасова і дакладна выканана работнікам, якому яно дано.

Нельга цярпець такога становішча, калі дырэктар, жадаючы апраўдацца ў дрэннай рабоце прадпрыемства, пастаянна спасылаецца на тое, што яго распараджэнні не былі выкананы, хоць яны былі правільныя і былі даны своечасова. Дырэктар абавязан ведаць сваіх падначаленых, правяраць выкананне адданых распараджэнняў і работнікаў невыканальных, неакуратных—замяняць лепшымі і больш дзельнымі работнікамі.

Неабходна рашуча ўмацаваць **адзінаначалле на прадпрыемствах** і дабіцца таго, каб дырэктар прадпрыемства стаў на справе поўнаўладным кіраўніком, цалкам адказваючым за стан прадпрыемства і за парадак на вытворчасці.

АБ УМАЦАВАННІ ТЭХНІЧНАГА КІРАЎНІЦТВА ВЫТВОРЧАСЦЮ. Работа прамысловасці і транспарта церпіць таксама яшчэ і таму, што кадры інжынераў і тэхнікаў ва многіх выпадках расстаўлены і скарыстоўваюцца няправільна.

На прадпрыемствах, у цэхах, г. зн. там, дзе непасрэдна выпрацоўваецца прадукцыя, часта бывае вялікі недахват у кваліфікаваных спецыялістах, у той-жа час вялікая колькасць гэтых апошніх асела на канцылярскай рабоце ў апаратах цэнтральных і мясцовых гаспадарчых устаноў.

Мы маем, таварышы, даныя аб расстаноўцы ў сістэме прамысловых наркаматаў на 214 тысяч спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і на 164 тысячы спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Гэтыя даныя наступным чынам характарызуюць расстаноўку спецыялістаў у прамысловасці.

З 214 тысяч спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй 95 тысяч чалавек або 45 процантаў знаходзяцца ў розных установах сістэмы наркаматаў, 51 тысяча чалавек або 24 проценты—у заводаўпраўленнях прамысловых прадпрыемстваў і толькі 68 тысяч чалавек або 31 процант усіх спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй знаходзяцца ў прамысловых прадпрыемствах непасрэдна на вытворчасці.

З 164 тысяч спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй 41 тысяча чалавек або 25 процантаў знаходзяцца ў розных установах наркаматаў, 41 тысяча або 25 процантаў знаходзяцца ў заводаўпраўленнях прамысловых прадпрыемстваў і 82 тысячы чалавек або 50 процантаў знаходзяцца ў прамысловых прадпрыемствах непасрэдна на вытворчасці.

У Наркамаце Нафтавай прамысловасці толькі 20 процантаў спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй працуе непасрэдна на вытворчасці; у Наркамаце Электрастанцый—толькі 16 процантаў; у Наркамаце Вугальнай Прамысловасці—27 процантаў; у Наркамаце Рыбнай Прамысловасці толькі 9 процантаў; у Наркамаце Лясной Прамысловасці — 24 проценты.

Падобная карціна ў расстаноўцы і скарыстанні спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй — і ў іншых прамысловых наркаматах. Такая няправільная практыка скарыстання інжынераў і тэхнікаў наносіць шкоду нашай народнай гаспадарцы, пазбаўляе прадпрыемствы належнага тэхнічнага кіраўніцтва. Даволі сказаць, таварышы, што пры наяўнасці ў прамысловасці вялікай колькасці спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на тых пасадах, якія павінны быць замешчаны інжынерамі, гэтых спецыялістаў аказваецца вельмі недастатковая колькасць.

У саставе начальнікаў цэхаў на прадпрыемствах ёсць усяго толькі 22 проценты спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у саставе намеснікаў начальнікаў цэхаў 32 проценты, у саставе начальнікаў змен, пралётаў, аддзелаў, участкаў, агрэгатаў — 20 процантаў і ў саставе цэхавых інжынераў толькі 60 процантаў. Усе астатнія работнікі ўказаных вышэй пасад не маюць спецыяльнай тэхнічнай адукацыі.

Апарат упраўлення гаспадаркай, як і ўвесь дзяржаўны апарат нашай краіны, мае велізарнае значэнне. У гэтым апараце павінна працаваць пэўная колькасць кваліфікаваных інжынераў і тэхнікаў. Але зусім ненармальна, калі гэты апарат раздувае свае штаты і скарыстоўвае інжынераў і тэхнікаў на канцылярскай рабоце, адцягваючы тым самым іх з вытворчасці.

Неабходна выправіць ненармальнасць у расстаноўцы кадраў інжынераў і тэхнікаў і накіраваць частку спецыялістаў, працуючых у цэнтральных і мясцовых гаспадарчых установах, на прадпрыемствы для ўмацавання тэхнічнага кіраўніцтва вытворчасцю.

Неабходна ўсямерна **ўмацаваць на прадпрыемствах тэхнічнае кіраўніцтва** вытворчасцю.

У адносінах маладых, канчаючых ВНУ спецыялістаў неабходна ўстанавіць такі парадак, каб кожны скончыўшы вышэйшую навучальную ўстанову атрымліваў вытворчы вопыт на прадпрыемстве, праходзіў у абавязковым парадку стаж практычнай работы—памочніка майстра, майстра, інжынера ў цэху.

АБ МАЙСТРУ. Вялікую ролю, таварышы, у справе навядзення парадку на нашых прадпрыемствах, у справе правільнай арганізацыі працы і забеспячэння найстражэйшай дысцыпліны тэхналагічнага працэса павінны адыграць майстры.

Аднак, па многіх нашых прадпрыемствах майстра звялі на становішча падсобнага рабочага або канторшчыка, які цэлы дзень заняты або беганінай па заводу за недастаючымі дэталямі, інструментамі, або рознага роду канторскай работай.

Майстар павінен быць разгружан ад неўласцівых яму абавязкаў.

Неабходна на прадпрыемствах **падняць ролю майстра** як непасрэднага арганізатара вытворчасці і паставіць справу такім чынам, каб майстар з'яўляўся поўнаправным кіраўніком на даручаным яму ўчастку вытворчасці, поўнасцю адказваючым за захоўванне тэхналагічнай дысцыпліны і за выкананне вытворчага задання па ўсіх паказальніках.

Такія меры, якія трэба прыняць па лініі гаспадарча-палітычных задач партарганізацый, каб ліквідаваць недахопы ў рабоце прамысловасці і транспарта.

IV.

Арганізацыйныя задачы партарганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

Таварышы, для таго, каб паспяхова вырашыць задачу ўздыму прамысловасці і транспарта, неабходна значна палепшыць нашу арганізацыйную работу ў галіне прамысловасці і транспарта.

Таварыш Сталін вучыць нас, што самі гаспадарчыя поспехі, іх моцнасць і працягласць цалкам і поўнасцю залежаць ад поспехаў партыйна-арганізацыйнай і партыйна-палітычнай работы, што без гэтых умоў гаспадарчыя поспехі могуць аказацца пабудаванымі на пяску.

Якія меры трэба прыняць па лініі арганізацыйных задач партарганізацый, каб ліквідаваць недахопы ў рабоце прамысловасці і транспарта?

Перш за ўсё тут гутарка ідзе аб тым, што ў мэтах узмацнення дапамогі наркаматам і прадпрыемствам прамысловасці і транспарта, **неабходна мець у гарадах, абласцях, краях і рэспубліках з развітай прамысловасцю не аднаго, а некалькі сакратароў гаркомаў і абкомаў партыі па прамысловасці,** адпаведна асноўным галінам прамысловасці, якія ёсць у горадзе, вобласці, краі, рэспубліцы, а таксама там, дзе гэта трэба, сакратара па чыгуначнаму транспарту і сакратара па воднаму транспарту.

Вядома, што зараз у нас у гаркомах і абкомах партыі прамысловасцю і транспартам займаецца толькі адзін з сакратароў. Вопыт паказаў, што гэта яўна недастаткова.

У праекце рэзалюцыі, разданай вам, прапануецца павялічыць колькасць сакратароў гаркомаў і абкомаў партыі, ведаючых прамысловасцю і транспартам.

Вельмі важнай справай для абкомаў і гаркомаў партыі будзе падбор сакратароў па прамысловасці. Гэта справа вельмі сур'ёзная. Да яе трэба падыйсці з усёй уважлівасцю і адказнасцю.

Трэба вылучыць на гэтыя пасты лепшых работнікаў, здольных па-бальшэвіцку ўлазіць у справы прамысловасці і транспарта, здольных не на словах, а на справе павярнуць увагу партарганізацый у бок прамысловасці і транспарта.

Сакратары па прамысловасці і транспарту абавязаны добра ведаць, што робіцца на прадпрыемствах, рэгулярна бываць на іх, павінны быць асабіста звязаны як з работнікамі прадпрыемстваў, так і з адпаведнымі наркаматамі, павінны дапамагаць ім у выкананні планаў і рашэнняў партыі па прамысловасці і транспарту, сістэматычна правяраць выкананне гэтых рашэнняў, ускрываць недахопы ў рабоце прадпрыемстваў і дабівацца ліквідацыі гэтых недахопаў.

Аб тым, як справяцца гаркомы, абкомы і ЦК кампартый са справай падбору сакратароў па прамысловасці і транспарту, трэба будзе ўжо ў бліжэйшы час меркаваць па рэзультатах работы прамысловасці і транспарта па асобных гарадах, абласцях, краях і рэспубліках.

Другой важнейшай арганізацыйнай задачай з'яўляецца значнае ўзмацненне ўвагі партыйных арганізацый да справы падбору кадраў, працуючых у прамысловасці і на транспарце.

Перш за ўсё неабходна **вывучаць, добра ведаць гаспадарчых і інжынерна-тэхнічных работнікаў прамысловых прадпрыемстваў і чыгунак.** Без такога вывучэння і без ведання людзей нельга правільна і своечасова вырашыць пытанне аб замене нягодных работнікаў і аб вылучэнні здольных, ініцыятыўных людзей.

Неабходна, таварышы, пакончыць з папяровым, канцылярскім вывучэннем работнікаў.

Трэба пакончыць з біялагічным падыходам пры падборы кадраў і правяраць работнікаў на справе, ацэньваць іх па рабоце, а не кіравацца анкетнымі данымі.

Да гэтага часу, не гледзячы на ўказанні партыі, ва многіх партыйных і гаспадарчых органах пры назначэнні работніка больш займаюцца высвятленнем яго радаслоўнай, выясненнем таго, кім былі яго дзядуля і бабуля, а не вывучэннем яго асабістых дзелавых і палітычных якасцей, яго здольнасцей.

Асноўным пытаннем у справе падбору кадраў з'яўляецца пытанне аб правільным вылучэнні новых работнікаў. Трэба смялей вылучаць добрых, здольных, ініцыятыўных работнікаў, умеючых арганізаваць жывую справу.

Пры гэтым трэба ўсвоіць, што **гутарка ідзе аб вылучэнні не толькі партыйных, але і непартыйных большэвікоў.**

Сярод беспартыйных многа чэсных і здольных работнікаў, якія хоць не састаяць у партыі, не маюць комуністычнага стажа, але працуюць часта лепш, больш добрасумленна, чым некаторыя комуністы са стажам.

Таварыш Сталін не раз высмейваў тых работнікаў, якія думаюць, што на кіруючыя пасады можна вылучаць толькі партыйных таварышоў. У 1931 годзе па нарадзе гаспадарнікаў таварыш Сталін гаварыў: «Некаторыя таварышы думаюць, што на кіруючыя пасады на фабрыках, на заводах можна вылучаць толькі партыйных таварышоў. На гэтай падставе яны нярэдка адціраюць здольных і ініцыятыўных беспартыйных таварышоў, вылучаючы на першае месца партыйцаў, хоць і менш здольных і не ініцыятыўных. Няма чаго і гаварыць, што няма нічога больш бязглуздага і рэакцыйнага, чым такая, з дазволу сказаць, «палітыка».

Вылучаючы здольных і ініцыятыўных работнікаў, трэба **своечасова ставіць пытанне аб замене нягодных, слабых, бязвольных работнікаў, замяняць балбатуноў, не здольных арганізаваць жывую справу.**

Нярэдка бывае, што завядзецца такі нікчэмны, не здольны на жывую справу балбатун і гадамі губіць справу. А нашы наркаматы, абкомы, гаркомы партыі спакойна глядзяць на гэта і не прымаюць мер к таму, каб выпыбіць такога, з дазволу сказаць, «работніка».

Бывае ў нас нярэдка так. Атрымае завод тэрміновае заданне па выпуску асабліва патрэбнай прадукцыі. А на чале гэтага прадпрыемства стаіць гора-гаспадарнік, не работнік, здольны выканаць гэта заданне, а балбатун.

Запытае сакратар абкома такога дырэктара, як ідзе справа з выкананнем задання, а балбатун адказвае,—«Націскаем, таварыш сакратар». Ну, сакратар і задаволен. Раз націскаюць, значыць справа будзе.

Аднак, неўзабаве высняецца, што ніякай справы няма і заданне не выконваецца. Зноў пытае дырэктара сакратар абкома: «У чым справа, чаму не выконваецца заданне?» «Асвайваем, таварыш сакратар»,—адказвае балбатун. Сакратар задавальняецца і гэтым адказам. Раз чалавек асвайвае, значыць будуць хутка рэзультаты. Але справа ўперад не рухаецца. Зноў запытанне да дырэктара: «Чаму да гэтага часу не выпускаеце прадукцыі?» «Заядае, таварыш сакратар, гэтымі днямі паправім справу». Праходзіць час, няма ніякай прадукцыі. «Што ў вас робіцца на заводзе?»,—пытае сакратар. «Устраняем непаладкі і няўвязкі»,—адказвае балбатун.

Так і марочыць без канца галаву. І калі, таварышы, пачэчаяння ўсё-ж такі дырэктар з вялікім спазненнем выпусціць нямнога прадукцыі, то не чакайце, што ў такога дырэктара прадукцыя будзе выпускацца сістэматычна. Чакайце, наадварот, што хутка ён спыніць гэты выпуск. І калі яго запытаеце: «Што здарылася, чаму вы толькі-што пачалі выпускаць прадукцыю і ўжо спынілі?» — то і ведайце, што балбатун і тут знойдзе вам адказ і ў такім выпадку абавязкова заявіць: «Задзелы ўсе з'едзены».

Вось так і водзяць за нос нашых сакратароў абкомаў такія гора-кіраўнікі прадпрыемстваў, такія балбатуны.

Узброіліся гэтыя балбатуны слоўцамі: «асвайваем», «заядае», «устраняем непаладкі і няўвязкі», і жывуць сабе за дзяржаўны кошт, расходуюць велізарныя ордэкі, а ў народную гаспадарку нічога не даюць.

А многія нашы кіраўнікі слухаюць такія адказы і задавальняюцца імі, хоць дакладна не ведаюць, што, уласна, хоча сказаць гора-гаспадарнік. Атрымліваецца, як гэта ў песні пяецца,—«...І хто яго знае, на што намякае». **(Смех).** У песні, праўда, нарэшце высняецца, аб чым ідзе гутарка. Там, як вы помніце, сэрца прымае некаторы ўдзел у гэтай справе, і справа праясняецца. А вось у адносінах балбатуноў справа так і астаецца неразгаданай. Тут сэрца, відавочна, мала. Трэба галавой папрацаваць і раскусіць своечасова балбатуна.

Пара, таварышы, выцягнуць такога сорту гаспадарнікаў на свет божы. **Балбатуноў, людзей, не здольных на жывую справу, трэба аслабаняць і ставіць на меншую работу, незалежна ад таго, з'яўляюцца яны партыйнымі ці беспартыйнымі.**

Ёсць у нас, таварышы, і работнікі другога тыпу—невукі. Ёсць у нас і такія. Невук—гэта чалавек, які нічога не ведае і ведаць нічога не хоча. Невук тэхнікі не вывучае, новай тэхнікі не прызнае, аб тэхналогіі паняцця не мае, у эканоміцы прадпрыемства не разбіраецца і не жадае разбірацца. Затое зазнайства ў такога невука хоць адбаўляй.

Невук пераконан у тым, што ён усё ведае і яму вывучаць няма чаго, і няма такой сілы ў прыродзе, якая магла-б пераканаць невука ў тым, што ён чаго-небудзь не ведае.

Аб адным з сваіх герояў Салтыкоў Шчэдрын пісаў: «Ён не быў ні тэхнолаг, ні інжынер... ён нічога не ведаў ні аб працэсе ўтварэння рэк, ні аб законах, па якіх яны цякуць уніз, а не ўверх, але быў пераконан, што варта толькі ўказаць: ад сіх месц да сіх—і на працягу адмеранай адлегласці, напэўна, узнікне мацярык, а затым парапейшаму, і направа і налева, будзе прадаўжаць цячы рака».

Існуюць падобныя невукі і ў наш час. Зойме такі невук пост дырэктара прадпрыемства або начальніка дарогі ці іншы які пост і нічога слухаць не хоча. Ты яму гаворыш аб новай тэхніцы, аб неабходнасці палепшання тэхналагічнага працэса, аб навядзенні чыстаты і парадку на прадпрыемстве, а ён сядзіць па вушы ў гразі, сядзіць моцна на сваёй невуцкай аснове і не звяртае ўвагі ні на якія парады, ні на якія ўказанні. **(У зале ажыўленне).** Я, моў, сам разумею, я сам усё магу. Ды яшчэ звычайна фанабэрыцца сваім пролетарскім паходжаннем.

Само сабой зразумела, што няма чаго чакаць ад такога, з дазволу сказаць, кіраўніка пераходу на выраб новай прадукцыі лепшай якасці і ўвядзення новай тэхнікі.

Трэба, таварышы, выкрываць такіх невукаў і гнаць іх у шыю ад кіраўніцтва. Нельга цярпець невукаў на чале прадпрыемстваў і наогул на кіруючых пастах. Яны толькі псуюць жывую справу. Але для таго, каб своечасова замяняць нягодных работнікаў, для таго, каб своечасова вылучаць новых людзей, знатакоў сваёй справы, трэба, таварышы, паправіць становішча спраў з вывучэннем, падборам і вылучэннем кадраў як у партыйных, так і ў гаспадарчых арганізацыях.

У прыватнасці, трэба рашуча палепшыць работу намеснікаў наркомаў па кадрах, якія працуюць ужо даўно, аднак, да гэтага часу праявілі сябе вельмі і вельмі слаба.

Некалькі слоў, таварышы, аб палітаддзелах чыгуначнага і воднага транспарта.

Тут трэба сказаць адно — **пара пакончыць з адрывам палітаддзелаў чыгуначнага і воднага транспарта ад тэрытарыяльных партыйных арганізацый і зрабіць палітаддзелы падсправаздачнымі абкомам і гаркомам партыі.**

Трэба прама і адкрыта сказаць, што палітаддзелы на транспарце, асабліва на чыгуначным, працуюць вельмі нездавальняюча, палітаддзелы працуюць па-канцылярску, замест работы займаюцца зборам шматлікіх зводак з месц, пасылаюць велізарную колькасць тэлеграфных і пісьмовых дырэктыў.

Многія палітаддзелы ператварыліся ў дрэнны прыдатак ведамственых устаноў транспарта, яны замазваюць ведамственыя недахопы і не выконваюць нават такога элементарнага абавязку, як сігналізацыя парторганам аб недахопах у рабоце транспарта.

Знаходзяцца такія работнікі палітаддзелаў, якія забылі аб сваіх большэвіцкіх абавязках перад партыяй і краінай, набылі сабе спакойнае жыццё за кошт дзяржавы і стаяць у баку ад работы па ўздыму транспарта.

Таварышы, з арганізацыйных пытанняў трэба спыніцца далей на пытанні аб гаспадарча-вытворчых актывах.

Трэба сказаць, што ў нас за апошні час аслабла работа з актывам. У многіх наркаматах зусім закінулі гэтую работу і не склікаюць актываў.

Гэта не ў малай ступені аб'ясняецца зазнайствам некаторых нашых кіраўнікоў.

Такія кіраўнікі лічаць, што яны самі ўсё ведаюць і не адчуваюць патрэбы ў тым, каб параіцца з актывам, каб улічыць вопыт нізавых работнікаў, інжынераў, тэхнікаў, стаханаўцаў.

Такія кіраўнікі баяцца разгарнуць крытыку і самакрытыку.

Працяг на 4-й стар.

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б)

Аб задачах партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

Даклад тав. Г. М. МАЛЕНКОВА

Такія кіраўнікі забываюць тое, чаму вучыць нас таварыш Сталін.

Вы помніце, як таварыш Сталін на нарадзе стаханаўцаў дзякаваў удзельнікаў нарады за дапамогу, якую яны аказалі сваімі выступленнямі і парадамі. Таварыш Сталін на гэтай нарадзе гаварыў: «Хіба можна сумнявацца ў тым, што кіраўнікі, якія пагарджаюць гэтым вопытам, не могуць лічыцца сапраўднымі кіраўнікамі?».

Неабходна **аднавіць значэнне вытворча-гаспадарчых актываў на прадпрыемствах і ў наркаматах.**

Актывы павінны адыгрываць значную ролю ў справе лепшага скарыстання вопыту нізавых гаспадарчых і партыйных работнікаў, інжынераў, тэхнікаў, стаханаўцаў. Актывы павінны адыгрываць значную ролю ў раз'ясненні работнікам прамысловасці значэння важнейшых мерапрыемстваў у галіне прамысловасці і транспарта. Актывы трэба збіраць як з прыцягненнем на іх работнікаў розных галін прамысловасці, так і па асобных галінах прамысловасці і транспарта. Гаспадарчыя кіраўнікі і партыйныя арганізацыі абавязаны старанна рыхтаваць сходы актываў з тым, каб забяспечыць на іх сур'ёзнае і дзелавое абмеркаванне пастаўленых пытанняў.

Цяпер аб соцспаборніцтве і стаханаўскім руху. Аб значэнні яго гаварыць няма чаго. Я хачу адзначыць толькі, што ў нас на многіх прадпрыемствах партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі нездавальняюча кіруюць справай соцспаборніцтва і стаханаўскім рухам.

Толькі фармальнымі адносінамі да кіраўніцтва стаханаўскім рухам можна аб'яснiць, што на прадпрыемствах могуць ужывацца такія факты, як ахват **стаханаўскім** рухам на прадпрыемстве палавіны і больш усіх рабочых і наяўнасць у той-жа час на гэтым прадпрыемстве гразі і захламленасці ў цэхах, наяўнасць вялікай колькасці рабочых, не выконваючых нормы, і нават невыкананне гэтым прадпрыемствам сваіх вытворчых планаў.

Неабходна **ўсямерна развіваць стаханаўскі рух,** накіроўваць ініцыятыву стаханаўцаў на павышэнне прадукцыйнасці працы, на вырашэнне важнейшых пытанняў вытворчасці, на падцягванне адстаючых участкаў вытворчасці.

Нарэшце, таварышы, апошняе пытанне. Гутарка ідзе аб тым, што на прадпрыемствах усё яшчэ працягваецца няправільная практыка правядзення ў рабочы час сходаў, пасяджэнняў, нарад грамадскіх арганізацый.

Вось чаму ў праекце рэзалюцыі, раздадзенай вам, прапануецца **безумоўна забараніць** партыйным, савецкім, прафсаюзным і іншым грамадскім арганізацыям:

а) **скліканне** на прадпрыемствах і ва ўстановах **у рабочы час сходаў, пасяджэнняў і ўсякага роду нарад;**

б) **выклік у рабочы час** рабочых і служачых;

в) зняцце рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў **для пасылкі** іх на правядзенне бягучых кампаній або ў камандзіроўкі па шэфскіх і т. п. справах;

г) **адцягненне ў рабочы час** рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў ад іх непасрэднай работы для ўдзелу па даручэнню грамадскіх арганізацый у камісіях і брыгадах па абследванню.

Трэба **раз назаўсёды ўстанавіць, што рабочыя і служачыя прадпрыемстваў і ўстаноў выконваюць даручэнні грамадскіх арганізацый толькі ў нерабочы час.**

Такія меры, якія трэба прыняць па лініі арганізацыйных задач партарганізацый, каб ліквідаваць недахопы ў рабоце прамысловасці і транспарта.

* * *

Таварышы, наша прамысловасць была і ёсць база развіцця ўсёй народнай гаспадаркі. Прамысловасць была і ёсць кіруючы пачатак ва ўсёй сістэме народнай гаспадаркі. Прамысловасць вядзе ўперад усю нашу сацыялістычную гаспадарку, уключаючы сельскую гаспадарку і транспарт. Прамысловасць была і ёсць база абароннай магутнасці краіны.

Задача заключаецца ў тым, каб нястомна рухаць уперад справу развіцця сацыялістычнай прамысловасці.

Новыя і вялікія задачы стаяць перад нашай прамысловасцю і транспартам у 1941 годзе. Неабходна справу арганізаваць так, каб ужо ў гэтым годзе ні ў адной вобласці, ні ў адным горадзе і прамысловым цэнтры не асталося ні аднаго адстаючага прадпрыемства.

У нашай прамысловасці не павінна быць адстаючых прадпрыемстваў. Усе заводы, фабрыкі, шахты, чыгункі абавязаны выконваць план.

Змагацца за выкананне плана, забяспечыць выкананне плана, працаваць па плану, гэта значыць:

а) выконваць гадавы, квартальны і месячны планы па вытворчасці прадукцыі не ў сярэднім, як гэта было да гэтага часу, а роўнамерна, па плану, па загадзя распрацаванаму графіку вырабу гатовай прадукцыі;

б) выконваць план не толькі ў сярэднім па галіне прамысловасці, як гэта было да гэтага часу, а выконваць яго па кожнаму прадпрыемству ў паасобку;

в) выконваць план не толькі ў сярэднім па прадпрыемству, як гэта было да гэтага часу, але выконваць план штодзённа, у кожным цэху, у кожнай брыгадзе, на кожным станку і ў кожнай змене;

г) выконваць план не толькі па колькасных паказальніках, але абавязкова і якасна, камплектна, па асартыменту, з захоўваннем устаноўленых стандартаў і па ўстаноўленаму планам сабекошту.

Мы павінны і можам дабіцца ўжо ў бліжэйшы час далейшага ўздыму нашай прамысловасці і транспарта.

Трэба толькі, каб усе нашы партыйныя арганізацыі, усе кіруючыя работнікі прамысловасці і транспарта з усёй бальшавіцкай настойлівасцю ўзяліся за неадкладную ліквідацыю недахопаў у рабоце прамысловасці і транспарта, карэнным чынам палепшылі сваю работу ў гэтай галіне.

Мы не можам задаволіцца ўжо дасягнутым і не бачыць буйных недахопаў у рабоце прамысловасці і транспарта. Цярпімасць да гэтых недахопаў надзвычай небяспечная і шкодная.

Нельга цярпець, каб у нас дзе-небудзь жылі і працвіталі настроі благадушнасці і задаволення дасягнутым. Такія настроі робяць работнікаў непатрабавальнымі і сляпымі ў адносінах да недахопаў. Такія настроі не да твару бальшавікам.

Бальшавік павінен вызначацца непрымірымасцю да недахопаў, патрабавальнасцю да сябе, да ўсёй сваёй работы. Гэтаму вучыць нас таварыш Сталін. **(Бурныя апладысменты).**

Для бальшавіка інтарэсы дзяржавы, інтарэсы сваёй радзімы павінны быць вышэй за ўсё. Бальшавік павінен быць дысцыплінаваным у выкананні рашэнняў партыі і ўрада. Закон ёсць закон для ўсіх. Мы ўсе слугі дзяржавы. Гэтаму вучыць нас таварыш Сталін. **(Апладысменты).**

Бальшавік павінен быць сапраўдным барацьбітом супроць руціны ў пытаннях новай тэхнікі, новай прадукцыі, новых металаў вытворчасці. Трэба выхоўваць у нашых работнікаў густ к таму, каб аўладаць тэхнікай, вылучаць такіх людзей, якія здольны асвойваць тэхніку, бо тэхніка без людзей ёсць хлам. Бальшавік — рэвалюцыянер у тэхніцы, у гаспадарцы — той, хто ўмее ламаць устарэўшыя традыцыі, замяняць іх новымі і ісці ўперад. Гэтаму вучыць нас таварыш Сталін. **(Апладысменты).**

Няма сумнення ў тым, што наша партыя, свята выконваючы ўказанні таварыша Сталіна, мабілізуючы ўсю масу рабочых, служачых, інжынераў і тэхнікаў, у найкарацейшыя тэрміны дабʼецца выключнай арганізаванасці, максімальнай прадукцыйнасці ў рабоце прамысловасці і транспарта. Прамысловасць і транспарт павінны і будуць працаваць значна лепш, будуць даваць прадукцыі па ўсіх галінах значна больш і больш высокай якасці.

Пад выпрабаваным і мудрым кіраўніцтвам правадыра народаў таварыша Сталіна наша вялікая радзіма пойдзе ўперад да новых, рашучых перамог камунізма. **(Бурныя апладысменты. Усе ўстаюць).**

А. Ушакоў

Пераход

Па расе, па пяску незнаёмых дарог
Цвёрды след нашых ног пралёг.
Спевам птушак, пахам смалістых ялін
Запрашаў нас лес на спачын.
Мы-ж ішлі ўсё далей і далей.

Нас сустрэла ў пажоўклых кустах лазняка
Ласкавай, ціхай гаворкай рака:
— Добра ў флягу халоднай вады набраць,
Добра смагу з засмяглага горла прагнаць!
Мы-ж прайшлі па мастку далей.

Пагасціць запрашалі калгаснікі нас —
Ураджаем садоў выслаўляўся калгас,
На падворках звісалі плады да зямлі...
Не прыстаючы нават, мы ўперад прайшлі,
Не спрабуючы яблык, сказалі: «Дзякуй».

Нас здзіўляла, адкуль у асенняга дня
Ды пры хмурым небе—гарачыня,
Ад чаго вінтоўкі, лапаты і ранцы
За плячыма былі лягчэйшымі з раніцы?—
Быццам хто падмяніў у дарозе.

А пад вечар ногі—цяжэй свінца...
І калі ўжо здавалася, што і канца
Не прадбачыцца доўгім, як вечнасць, шляхам,
Пра вялікі прывал абвясцілі нам.
Гэткай мяккай зямля не была ніколі!

І сказаў нам весела строгі камбат:
— Рота з гонарам выканала загад.
Як відаць, мы нездарма вучыліся год,
І гатовы цяпер на любы пераход
І на іншыя выпрабаванні.

Выстаўка ў Барачавічах да Дня Чырвонай Арміі

У Баранавічах адкрываецца выстаўка жывапісу, графікі і скульптуры, якую мастакі вобласці прысвячаюць 23-й гадавіне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

На выстаўцы паказваецца работы таленавітага жывапісца і графіка М. Сеўрука, Яноўскай, Белецкай, Шэрэра, маладога скульптара Есёна, Грушко, Уманскага, які падрыхтаваў рад вострых палітычных карыкатур, і іншых мастакоў вобласці.

Узбагаціць рэпертуар тэатраў савецкай драматургіяй

14—15 лютага адбылася скліканая Упраўленнем па справах мастацтваў пры СНК БССР рэспубліканская нарада дырэктараў і мастацкіх кіраўнікоў тэатраў, драматургаў, кампазітараў, мастакоў па пытанню аб выніках работы тэатраў у 1940 годзе і рэпертуарных планах 1941 года. З дакладам па гэту тэму выступіў начальнік Упраўлення па справах мастацтваў тав. **А. Б. Озірскі.** Дакладчык зрабіў аналіз рэпертуарных планаў тэатраў рэспублікі і спыніўся на пытаннях работы тэатраў з драматургамі, на становішчы тэатральнай крытыкі і арганізацыі масавага гледача. Даклад выклікаў ажыўленае абмеркаванне.

Тав. **Данілаў** (Пінскі абласны драмтэатр) у сваім выступленні заўважае:

— Наш тэатр хвалюе пытанне стварэння новых савецкіх п'ес. Многія беларускія драматургі не працуюць актыўна над стварэннем новых драматычных твораў. Тэатры павінны прыйсці на дапамогу драматургам. Тав. Данілаў паставіў таксама пытанне аб неабходнасці перагляду зацверджаных рэпертуарных планаў.

Тав. **Ламакіна** (дырэктар Дзяржаўнага Польскага драмтэатра БССР) згадзілася з выказанымі дакладчыкам заўвагамі аб тым, што ў Польскім тэатры адсутнічае сапраўдная работа па стварэнню арыгінальнай польскай савецкай драматургіі. «Аптымістычная трагедыя» Вішнеўскага, пастаўленая ў тэатры, адыграла вялікую ролю ў далучэнні тэатра да лепшага савецкага рэпертуару. На 1941 год тэатр уключыў у свой рэпертуарны план «Казку» Святлова і «Непакойную старасць» Рахманава. Зараз група актораў тэатра працуе над стварэннем польскай савецкай п'есы.

Тав. **Сяргееў** (дырэктар Дзяржаўнага Рускага драмтэатра БССР) спыніўся ў сваім выступленні, галоўным чынам, на пытанні наведваемасці.

— У Магілеўскім тэатры зроблена ўсё магчымае для прыцягнення гледача, але пакуль становішча застаецца трывожным. Тэатру цяжка працаваць у адным горадзе 5—6 месяцаў. Неабходна своечасова прадастаўляць яму магчымасць мяняць пляцоўку. Тав. Сяргееў указаў таксама на неабходнасць арганізацыі дзяржаўных заказаў драматургам з тым разлікам, каб частка драматургаў працавала спецыяльна для Рускага тэатра.

Аб рабоце мастакоў гаварыў тав. **Малкін:**

— Мастакі адыгрываюць не малую ролю ў стварэнні спектакляў. Але чамусьці работа мастакоў наогул выпадае з поля гледжання Упраўлення. Гэта—вынік няверʼя ў сілы мастакоў Беларусі. Неабходна зрабіць пералом у гэтых адносінах. Было-б добра, калі-б мастакі (як і рэжысёры і акторы) загадзя ведалі, над чым яны будуць працаваць у бягучым годзе.

Трэба запрашаць мастакоў з іншых рэспублік, але яны не павінны быць выпадковымі гасцямі. Запрашаць трэба такіх мастакоў, у якіх мы маглі-б атрымаць творчую дапамогу.

Тав. Малкін паставіў пытанне аб неабходнасці арганізацыі і выпуску ў Беларусі журнала, які стаў-бы трыбунай работнікаў мастацтваў рэспублікі.

Рэзкай крытыцы падвергнуў работу Упраўлення тав. **Гольдсберг** (Баранавічы). Ён гаварыў, галоўным чынам, аб тым, што работнікі Упраўлення недастаткова добра знаёмы з творчай работай кожнага тэатра, а гэта, натуральна, сказваецца на якасці зацверджаных рэпертуарных планаў. Гаворачы аб тэатральнай крытыцы, тав. Гольдсберг прапанаваў склікаць рэспубліканскі семінар для павышэння кваліфікацыі тэатральных крытыкаў.

На пытанні аб тэатральнай крытыцы спыніўся таксама тав. **Пацехін** (мастацкі кіраўнік Палескага абласнога драмтэатра).

— Абласная прэса вельмі мала аддае ўвагі нашым спектаклям. Вельмі рэдка можна сустрэць у газеце рэцэнзію на спектакль. Тав. Пацехін расказаў аб тым, што ён спрабаваў весці работу, наладжваць сувязь з драматургамі па стварэнню п'ес для тэатра, але кожны раз гэтыя спробы канчаліся няўдачай. Упраўленне па справах мастацтваў павінна аказваць дапамогу ў наладжванні кантакту тэатраў з драматургамі. Апрача таго, за Упраўленнем павінны быць згуртаваны ўсе навінкі савецкай драматургіі з тым разлікам, каб перыферыйныя тэатры мелі магчымасць знаёміцца з імі.

Тав **Рубінштэйн** (старшыня Саюза мастакоў БССР), як і тав. Малкін, гаварыў аб адсутнасці ўзаемнай сувязі тэатраў з мастакамі, аб недастатковай увазе да творчасці тэатральных мастакоў.

Дырэктар Бабруйскага калгасна-саўгаснага тэатра т. **Эпштэйн** звярнуўся да вядучых работнікаў рэспубліканскіх тэатраў з просьбай аб аказанні творчай дапамогі калгасна-саўгасным тэатрам. Прыёмка спектакляў сумесна з абласнымі аддзеламі мастацтваў, кансультацыя і пастаноўка п'ес, — вось формы гэтай дапамогі.

З цікавай прамовай выступіў мастацкі кіраўнік Мінскага Дзяржаўнага беларускага драмтэатра тав. **Рахленка.**

— Наша задача, — гаворыць ён, — стварэнне такога тэатра, на сцэне якога вырашаліся-б пытанні вялікіх пачуццяў, пытанні, што дапамагалі-б нараджэнню пачуцця новага ў савецкага грамадзяніна. Гэты тэатр павінен расказваць аб геraічных справах савецкіх людзей. І толькі забыццём гэтага можна вытлумачыць тое становішча, што многія драматургі пачалі пісаць слязліва-сантыментальныя п'есы, якія зусім не патрэбны нашаму гледачу. Пытанні сям'і, шлюбу, пытанні новай маралі, новай этыкі чамусьці часта вырашаюцца праз слязу, праз меладраму. А ці-ж гэта патрэбна нашаму народу, народу-герою, будаўніку камунізма!

Гаворачы аб рабоце з драматургамі, тав. Рахленка падкрэсліў, што чакаць, пакуль паявяцца класічныя савецкія п'есы,—нельга. Няхай п'еса будзе недасканалая па форме, але мыслі ў ёй павінны быць дасканалыя.

Тав. **Кобрынскі** (Упраўленне па справах мастацтваў) у сваім выступленні зрабіў кароткі агляд творчай работы калгасна-саўгасных тэатраў, якія вядуць вялікую ідэйна-выхаваўчую работу сярод шырокіх мас працоўных. Закранаючы пытанні рэпертуару і падбору класічных твораў, тав. Кобрынскі адзначыў, што пры выбары класічных п'ес трэба кіравацца тым, каб гледачу былі паказаны ў першую чаргу тыя творы, якія закранаюць хвалюючыя нас тэмы любві да радзімы, абароны радзімы. Гаворачы аб рэпертуары польскага тэатра, тав. Кобрынскі заўважыў, што цяжка лічыць яго здавальняючым, бо як у 1940, так і ў 1941 годзе ў яго рэпертуарным плане адсутнічаюць арыгінальныя савецкія п'есы.

На няўвагу многіх тэатраў (калгасна-саўгасных і абласных, у першую чаргу) да работы з драматургамі, на баязлівасць рызыкі ў рабоце з яшчэ незарэкамендаваўшымі сябе драматургамі ўказаў, спасылаючыся на ўласны вопыт работы з тэатрамі, тав. **Я. Маўр.**

— Савецкі рэпертуар—аснова жыцця кожнага савецкага тэатра, — кажа тав. **Гершэнзон** (рэпертком БССР). Ачышчаючы сцэну ад п'ес, якія скажаюць савецкую рэчаіснасць, ад саладжавых меладрам, фальшывых твораў тыпу «На беразе Нёмана», «Шчасце», тэатры павінны нястомна змагацца за пастаноўку савецкіх п'ес, у аснове якіх ляжыць глыбокая ідэя, праўда чалавечага пачуцця. Кожны тэатр павінен згуртоўваць вакол сябе драматургаў, працаваць з імі. Недапусцім і той факт, што тэатры часам абыякава ставяцца да пастаноўкі савецкіх п'ес. Напрыклад, Віцебскі тэатр, які ставіць зараз арыгінальную беларускую п'есу «Ірынка» К. Чорнага, не заняў у гэтым спектаклі лепшых актораў і наогул безуважна падышоў да пастаноўкі. Няма ў кіраўнікоў тэатраў і клопату пра захаванне ў рэпертуары спектакляў, пастаўленых па творах савецкіх драматургаў (Тэатр музкамедыі і інш.).

Мастацкі кіраўнік Баранавіцкага абласнога тэатра тав. **Нахімаў-Дольскі** заўважае, што абласным тэатрам патрэбна абслугоўваць больш шырокія масы гледачоў, часцей выязджаючы ў раёны, у гарады сваёй вобласці.

Тт. **Гантман і Грубін** (Тэатр оперы і балета БССР) гаварылі аб неабходнасці разгарнуць дзейсную падрыхтоўку да 25-годдзя Вялікага Кастрычніка, разгарнуць работу па стварэнню новых арыгінальных оперных твораў.

З рэзкай крытыкай кіраўніцтва Опернага тэатра выступіў тав. **Шчаглоў** (Упраўленне па справах мастацтваў), які ўказаў, што Оперны тэатр пасля дэкады недапусціма аслабіў работу з кампазітарамі, не праяўляе ніякай ініцыятывы ва ўзбагачэнні свайго рэпертуару арыгінальнымі творамі, не працуе і над лепшымі творамі рускай опернай класікі.

Не клапоціцца пра стварэнне арыгінальных твораў і Тэатр музкамедыі БССР. Гэты тэатр надзвычай нядбайна аднёсся да работы над першай беларускай музыкальнай камедыяй «Зарэчны барок» і цяпер зусім не звязан з кампазітарамі.

Тав. Шчаглоў указвае і на слабасць нашай музыкальнай крытыкі. Ён заўважае, што музыказнаўцы—работнікі Кансерваторыі, замест распрацоўкі тэм гісторыі беларускай музыкі, разгляду творчасці беларускіх кампазітараў, займаюцца класікай — напрыклад, пішуць работы пра Бетховена.

Тав. **Дорскі** (Віцебскі Дзяржаўны беларускі драмтэатр) адзначае, што асноўная задача тэатраў—узбагачэнне свайго рэпертуару п'есамі савецкіх драматургаў. Патрэбна ўважліва, любоўна падыходзіць да савецкай драматургіі, ставіць усе лепшыя творы савецкіх драматургаў. Віцебскі тэатр трымае сталую сувязь з беларускімі пісьменнікамі П. Глебкам, К. Чорным, В. Вольскім, М. Пасляловічам, якія пішуць для тэатра новыя п'есы. Тэатр творча звязан і з радам рускіх драматургаў.

Аб рабоце з драматургамі гаворыць і дырэктар Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР тав **Гольдшварц.** Яўрэйскі тэатр працуе з сямю драматургамі Мінска і Масквы, у выніку чаго ў гэтым годзе ім будзе пастаўлена некалькі арыгінальных п'ес аб нашай рэчаіснасці.

У рабоце нарады прыняў удзел сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Малін,** які выступіў у заключэнні з кароткай прамовай.

* * *

На нарадзе быў абмеркаван план гастролей тэатраў рэспублікі на 1941 год. У сваім дакладзе па гэтаму пытанню тав. **Ліберзон** (начальнік тэатральнага аддзела Упраўлення па справах мастацтваў) адзначыў, што ў гэтым годзе мяркуецца выезд раду дзяржаўных тэатраў БССР у братнія рэспублікі. Тэатр оперы і балета БССР паедзе на гастролі ў Ленінград, Яўрэйскі тэатр—у Літоўскую ССР, Мінскі і Віцебскі дзяржаўныя беларускія—на Украіну.

Абмеркаванне даклада паказала неабходнасць больш удумлівай і дасканалай распрацоўкі плана гастролей.

Тэатры павінны ўсю сваю работу накіраваць на паспяховае вырашэнне творчых задач, якія ставіць перад мастацтвам гераічная эпоха будаўніцтва камунізма: узнімаць мабілізацыйную гатоўнасць савецкага народа, выхоўваць у ім баявы дух, дзейсна служыць справе камуністычнага выхавання працоўных. Нястомна і клапатліва ўзбагачаць рэпертуар п'есамі савецкіх драматургаў, стала і сур'ёзна працаваць з беларускімі драматургамі, выяўляючы і выхоўваючы маладыя кадры,—вось асноўныя вывады, якія зрабіла нарада.

І. Дорскі

Пошукі вобраза

Надыходзячае 25-годдзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ставіць перад пісьменнікамі Беларусі благародную і складаную задачу стварэння яркіх твораў аб нашай рэчаіснасці, аб сёнешнім радасным жыцці беларускага народа, аб яго гераічным мінулым. І зразумела, што адной з асноўных тэм аб гераічным мінулым нашага народа з'яўляецца тэма «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». У творах на гэту тэму паэты, празаікі, драматургі ствараць вобразы нашых вялікіх сучаснікаў.

Творчы вопыт работы над гэтымі складанымі вобразамі нязначны. Але ён вельмі каштоўны. Гэты вопыт павінен быць вывучан, у ім павінны быць знойдзены тыя зерні творчых знаходак, з якіх павінны вырасці больш дасканалыя творы аб вялікіх героях.

Перад намі драматычная паэма Пятра Глебкі «Над Бярозай-ракой»*). Твор гэты, у якім паказан вобраз саратніка вялікага Сталіна — Серго Орджанікідзе, узбагачае вопыт работы над вобразамі правадыроў.

Словы А. М. Горкага аб тым, што «мастацкасць без вымыслу немагчыма», з'яўляецца ледзь не асноўным прынцыпам майстроў усіх відаў і жанраў мастацтваў. Але як быць з вымыслам, калі пісьменнік ставіць перад сабою задачу мастацка ўвасобіць вобраз канкрэтнага гістарычнага дзеяча? Як быць, калі трэба паказаць правадыра альбо героя, імя якога ва ўсіх на вуснах, кожны крок якога ва ўсіх ў памяці, любоў да якога ў сэрцы ўсяго народа?

У вырашэнні гэтай творчай праблемы П. Глебка, працуючы над вобразам Серго, смела і творча арыгінальна развіў тое правільнае і каштоўнае, што было знойдзена да яго. Дакладнае вывучэнне гістарычнага матэрыялу, глыбокае веданне эпохі дало П. Глебку магчымасць адчуць своеасаблівасць вобраза Серго, яго ўнутраны свет, сілу яго пачуццяў, імкненне яго страсцей. І гэта дало П. Глебку магчымасць не займацца інтэрпрэтацыяй вядомых гістарычных фактаў і дэталей аб дзейнасці Серго ў Беларусі, не ўкладаць у яго вусны толькі сапраўдныя прамовы, не ілюстрыраваць вобраз архіўнымі справкамі, а сілай паэтычнай фантазіі стварыць поўнацэнны вобраз, іншы раз смела абмінаючы «сапраўдныя факты». Гэта ён робіць для таго, каб факт, які можа быць толькі «рысай мінуты», не засланіў сабою праўду эпохі, каб выпадковасць не замяніла неабходнасці, каб праўда факта не засланіла праўды сэнсу.

І вымысел П. Глебкі смелы таму, што ён пабудаван на аснове дакладнага вывучэння гісторыі, фантазія яго свабодна, таму што яна ўсхвалявана падзеямі вялікага жыцця. Гэта смеласць вымыслу і фантазіі перш за ўсё сказалася на пабудове сюжэту драматычнай паэмы.

Вобраз Серго, які праходзіць праз усю п'есу, знаходзіцца ў сюжэтнай сувязі з гераічнымі ўчынкамі Азорыча і Таццяны Марыч, з трагедыяй Насты, з мужнасцю партызана Сімхі Штэйнера і байца дзевятай роты Макарэнкі, сустракаецца з каварствам здрадніка Бэсмана. Пра ўсе гэтыя факты з матэрыялаў аб дзейнасці Серго ў Беларусі невядома. П. Глебка разгортвае сюжэт на ўдзячным матэрыяле, які ўскрывае тыповыя з'явы паказваемай эпохі.

Нельга сказаць, што, імкнучыся паказаць вобраз Серго мастацка, П. Глебка наогул унікае фактаў. Ён разумее, што мастак не перастае быць мастаком, калі ён выкарыстоўвае факт, якому само жыццё надало тыповыя рысы.

П. Глебка ў сваёй драматычнай паэме выкарыстоўвае вядомы факт, які апісан у гістарычных матэрыялах і ўспамінах, —факт смелай разведкі Серго ў тыл белапалякаў. Але аўтар выкарыстоўвае гэты факт не для таго, каб фактычным матэрыялам пацвердзіць вымысел, каб сапраўдным матэрыялам паказаць веданне эпохі, а для таго, каб захаваная ў гэтым факце тыповая падзея дапамагла раскрыць тыповыя рысы вобраза Серго, у дадзеным выпадку яго мужны гераічны характар. Прычым гэты факт робіцца ў аўтара матэрыялам, карыстаючыся якім ён стварае сваё бачанне падзей, сваё разуменне іх, свае да іх адносіны.

Гісторыкі расказваюць аб разведцы Серго скупа. І хоць ведаеш, што П. Глебка многае выдумаў сам, яго апавяданне хвалюе таму, што ён паказвае жалезную неабходнасць такога ўчынку, нараджэнне яго, значэнне яго ў справе вызвалення Беларусі ад белапалякаў, мужнасць і волю да перамогі Серго і яго баявых таварышоў.

Дзянікін з поўдня рушыць на Маскву,
Патрэбна кінуць сілы ўсе туды.
Каб развязаць для гэтага нам рукі,
Каб утрымаць Калінкавічы, Гомель,
Цэнтральныя вузлы ад Поўдня на Маскву,
Спыніць палякаў трэба на Бярозе,
І вось мяне паслаў таварыш Сталін
І загадаў узяць назад Барысаў.
Звяртаюся да вас: дапамажыце.
Разведка наша зблытала нашчэнт:
Дзе вораг, колькі сіл у іх—не знае.
Нам трэба перабрацца праз фронт
І аб усім даведацца дакладна...—

так тлумачыць Серго камандзірам сваё рашэнне аб неабходнасці разведкі.

П. Глебка праў, калі яго цікавіць не тое, ці былі сказаны гэтыя словы, а тое, што яны маглі быць сказаны, не тое, што адбылося, а тое, што магло адбыцца.

П. Глебка, фантазіруючы на матэрыяле гістарычнай рэчаіснасці, стварае праўду жыцця і творча даказвае неабходнасць вымыслу нават там, дзе пытанне ідзе аб канкрэтных гістарычных справах і людзях. Гэты прынцып дапамагае П. Глебку не ілюстрыраваць паасобныя моманты дзейнасці Серго ў Беларусі, а — паказаць Серго ў дзеянні, якое само раскрывае характар героя.

Аўтар уводзіць Серго ў п'есу тады, калі яго дзеянні неабходны, калі ад смеласці героя, ад яго характару, ад празорлівасці яго розуму, ад сілы яго волі залежыць перамога ці паражэнне, жыццё ці смерць.

...Здрадніцкай рукой шпіёна Бэсмана камісар Азорыч кінут у рукі ворага. У палку не ведаюць прычыны знікнення Азорыча. Ворагі распаўсюджваюць чуткі, што Азорыч сам уцёк да белапалякаў. Разведка не можа ўстанавіць месцазнаходжання варожых войск. Невядома іх колькасць. А вораг каварны, і ён блізка. І калі ён пяройдзе апошні рубеж — раку Бярэзіну, — яму адкрыецца шлях на Оршу і Смаленск. Толькі велізарная сіла можа папярэдзіць катастрофу. І папярэдзіць яе можна толькі сёння. Заўтра будзе позна. Сёння ці ніколі... І тады з'яўляецца Серго.

У гэтай сітуацыі Серго аказваецца рухаючай сілай, ён нясе велізарную драматычна-напружаную функцыю, ён дзейнічае ў імя мэты, якая яму даражэй за ўсё, бо гэта мэта — жыццё і перамога народа. Падрыхтаванасць і неабходнасць, а не выпадковасць дзеяння, паказ героя ў момант велізарнага канфлікта служыць той-жа асноўнай і галоўнай мэце — не ілюстрыраваць паасобныя сцэны з жыцця Серго, а ўскрыць характар вобраза.

Зрабілася амаль звычаем паказваць адну з асноўных рысаў правадыроў і іх саратнікаў — гуманізм — метадам кантрасту, шляхам механічнага процістаўлення суровасці правадыра і мяккасці чалавека. П. Глебка гэту рысу раскрывае ў сюжэтным развіцці п'есы, ва ўзаемаадносінах Серго з іншымі дзеючымі асобамі паэмы, у прыватнасці з Нічыпарам Мелехам. Але вось Серго доўга няма. Мелех справакаваны ворагамі. Ён аказваецца сярод бунтаўшчыкоў. Серго затадвае разброіць ашуканага ворагамі Мелеха. Але Серго вельмі глыбока разумее простага чалавека, вельмі горача верыць у народ, каб не разабрацца, дзе ашуканы чалавек і дзе вораг. І ён дае Мелеху магчымасць гераічным учынкам змыць сваю ганьбу. Мелех глыбока ацаніў чалавечнасць Серго. Непісьменны Мелех дыктуе дадому пісьмо:

А вывеў цёмнага мяне на шлях
Адзін вялікай праўды чалавек.
Завуць яго Серго Орджанікідзе.

Сюжэт драматычнай паэмы развіваецца, адны сітуацыі змяняюцца другімі, і ў гэтым развіцці паказваецца характар таго, хто рухае сюжэт, хто сваёй сілай і воляй змяняе суровы і непакорны ход падзей.

У гэтым развіцці аўтар паказвае не толькі гуманізм Серго, але і яго веру ў перамогу, яго ўменне вучыцца ад мас і вучыць масы, яго ўменне слухаць і разумець простага чалавека, адзінства мыслей і дзеяння і рад іншых якасцей сапраўднага дзеяча рэвалюцыі. Аднак, вобраз Серго П. Глебка раскрывае не толькі паказам таго, што робіць Серго, але і паказваючы, што робіцца ў яго душы. П. Глебка імкнецца паказаць ход мыслей свайго героя, яго перажыванні, страснасць яго мар, яго радасці і смутак, унутраную барацьбу, адкрываючы перад намі ўнутраны свет, адкрыты толькі выбражэнню паэта.

Серго гаворыць са Смаленскам. Ля прамога провада Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. Як сказаць Сталіну аб тым, што ён сам рашыў пайсці ў разведку, як падрыхтаваць яго, каб не выклікаць у ім трывогі і ў той-жа час атрымаць дазвол? Чытаючы гутарку Серго са Сталіным, мы бачым, як усе гэтыя мыслі нараджаюцца, як яны развіваюцца, адчуваем, як моцна б'ецца сэрца Серго, калі ён атрымлівае дазвол на асабістую разведку, адчуваем, якую вялікую любоў да Сталіна нясе Серго ў сваім сэрцы.

Пранікнуўшы ва ўнутраны свет героя, раскрываючы яго, П. Глебка раскрывае перад намі і страсную рамантычную мару героя.

Але за сцюдзёнай асенняй нягодай
Настане вясна. Закрасуюць палеткі,
Абудзяцца пушчы, успеняцца воды
І вырастуць тут над магілаю кветкі...
...Бывай, наш таварыш! Будзь пэўны, што скора
Пазбудзецца цяжкай няволі краіна.

Так марыць можа толькі чалавек, які глыбока верыць у сваю справу, у заўтрашні дзень перамогі і шчасця народа.

Можна прывесці яшчэ рад прыкладаў, якія сведчаць аб тым, што П. Глебка імкнецца пранікнуць ва ўнутраны свет Серго, каб стварыць шматгранны, праўдзівы вобраз. Серго ў «Над Бярозай-ракой» і мужны змагар, і страсны летуценнік, і смелы воін, і празорлівы камандзір, і багатай душы чалавек, які ўмее горача любіць і гэтак-жа горача ненавідзець.

Аднак, можна папракнуць П. Глебку ў тым, што нягледзячы на яго імкненне раскрыць унутраны свет героя, яго твор не стаў яшчэ крыніцай глыбокага пазнання вялікай душы Серго. Інтымнае жыццё Серго, яго перажыванні, не ва ўсёй паўнаце раскрыты пісьменнікам, з-за чаго некаторыя сцэны атрымаліся схематычнымі, а часам і халоднымі.

Можна ўказаць на рад недахопаў п'есы, якія, аднак, не парушаюць паслядоўнасці пошукаў вобраза Серго. У гэтых пошуках П. Глебка ішоў па правільнаму шляху. Глыбока разумеючы і адчуваючы эпоху, паэт смела карыстаўся вымыслам, паказаў героя не ілюстрацыйна, а ў дзеянні, у канфлікце, паставіў яго ў становішча, у якім найбольш ярка і арганічна мог раскрыцца яго характар. Паказаны не толькі дзеянні Серго, але зроблен рад удалых спроб раскрыць яго ўнутраны свет. А галоўнае — сваім паэтычным выбражэннем П. Глебка стварыў вобраз мастацка пераканаўчы, прымусіўшы нас паверыць у тое, што іменна такім быў Серго.

Такая работа, якая смела памячае шляхі стварэння вобразаў вялікіх гістарычных дзеячоў, якая выяўляе парасткі ўжо знойдзенага, — спрыяе росту савецкай драматургіі, спрыяе з'яўленню новых яркіх твораў, у якіх сродкамі паэзіі і драматургіі будуць увасоблены вобразы геніяльных правадыроў і іх баявых саратнікаў.

*) Журнал «Полымя рэвалюцыі», № 7, 1940.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У1192. Мінск, друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394.